

ЮБІЛЕЙ ПЕДАГАГІЧНАГА УНІВЕРСІТЭТА 4

ЛЮДЗЕЙ САПСАВАЛА КВАТЭРНАЕ ПЫТАННЕ МС





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

22 ЛІСТАПАДА 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 222 (29089)


9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Вольга ВЕРАМЕЙ, начальнік галоўнага ўпраўлення горадабудаўніцтва, праектнай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва:**

*«Міністэрства дало даручэнне, каб і вертыкальныя, і гарызантальныя камунікацыі былі забяспечаны безбар'ерным асяроддзем. Каб кожны чалавек, страціўшы здольнасці да самастойнага перамяшчэння, мог камфортна адчуваць сябе ў сваёй кватэры, пад'ездзе. У прыватнасці, пастаўлена задача, каб у шматкватэрных блакіраваных жылых дамах, якія будуюцца для маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў або іншых катэгорый грамадзян, былі ліфты».*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

г. Слуцк.

# ЛЁТАЦЬ — ГЭТА ПРОСТА!

## КОРАТКА

• Спецыяльная рабочая група зоймецца распрацоўкай стратэгіі стварэння ў Беларусі сетак сотавай мабільнай электрасувязі пятага пакалення — 5G.

• **У Беларусі да канца года плануецца зацвердзіць 26 будаўнічых нормаў.**

• У Брэсцкай вобласці амаль кожны трэці работнік задзейнічаны ў сферы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва.

• **У Гродне за два дні ад тэлефонных махляроў пацярпела больш за 50 чалавек, з іх карт-рахункаў невядомыя знялі грошы.**



ISSN 1990 - 763X

Сітуацыя

# ВЫЙСЦІ З «НЕБЯСПЕЧНАЙ ГУЛЬНІ»

## Як сёння рэабілітуюць нарказалежных

**У Беларусі пад наглядам урачоў знаходзіцца больш за 12,8 тысячы нарказалежных. Але спецыялісты заўважаюць, што насамрэч іх значна больш: каля 88,5 тысячы чалавек ужываюць наркотыкі калі не сістэматычна, то эпізадычна. Нягледзячы на тое, што на сітуацыю з наркаспажываннем істотна паўплывала рэалізацыя Дэкрэта № 6 «Аб неадкладных мерах па супрацьдзеянні незаконнаму абароту наркотыкаў» і колькасць нарказалежных паступова зніжаецца, рызыка ўсё ж застаецца. У прыватнасці, транзіт наркатычных рэчываў праз нашу краіну павялічваецца. Ці патрэбна паслабленне па «наркатычным» артыкуле Крымінальнага кодэкса і як рэабілітуюць сёння нарказалежных, у прыватнасці, ці могуць яны різлічваць на працаўладкаванне, расказалі спецыялісты.**

— Мінск знаходзіцца на «перадавой» наркатычнай праблемы. На ўліку стаіць 5181 чалавек, — расказвае **намеснік галоўнага ўрача па амбулаторным раздзеле работы Гарадскога клінічнага наркалагічнага дыспансера Жанна ІСТОМІНА.** — Дапамога нарказалежным аказваецца як на ўмовах пастаноўкі на ўлік з афармленнем медыцынскай дакументацыі і занясеннем усіх асабістых звестак, так і платна на ананімнай аснове без сацыяльных наступстваў.

СТАР. 4




# ТАЯМНІЦА ЎРАДАВАЙ СУВЯЗІ

## Хутка чыноўнікі будуць карыстацца абароненымі мабільнымі тэлефонамі

**У пачатку жніўня Прэзідэнт наведаў адзін з аб'ектаў урадавай сувязі Камітэта дзяржаўнай бяспекі. Тады была анансавана размова аб далейшых кроках у распрацоўцы абароненай сувязі, і ўчора Аляксандр Лукашэнка правёў нараду аб развіцці «закрытых» камунікацый.**

«У Прэзідэнта на стале — распрацоўкі стацыянарнай айчыннай сувязі, усе найвышэйшыя службовыя асобы, члены ўрада маюць неблагую стацыянарную сувязь. Але самае галоўнае, што мы ў гэтым выпадку абсалютна незалежныя. Мы стварылі ўласныя сістэмы, цэнтры шыфравання інфармацыі, недаступныя для разведак іншых дзяржаў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён згадзіўся, што зроблена ў гэтым плане нямала — але далёка не ўсё. Напрыклад, сёння ў Беларусі ўжо выпускаюць сістэмы мабільнай сувязі.

«У кожнага сёння ёсць мабільны тэлефон. Узяў, патэлефанаваў — увесь свет ведае, пра што ты гаворыш. Трэба стварыць такую сувязь — але абароненую, як у народзе кажуць, «сакрэтную». Мы тэсціруем такую сувязь, але ёсць шэраг недахопаў», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.

Нядаўна ён даручыў Аператыўна-аналітычнаму цэнтру пры Прэзідэнце праверыць, як працуе КДБ па «закрытай» сувязі, наколькі яна надзейная і недаступная для разведак іншых дзяржаў, пабочных асоб.

Зазірнуў Аляксандр Лукашэнка і глыбей: работа па сувязі не проста дае нейкі вынік у выглядзе прадукту як такога, але рухае беларускую школу шыфравання і стварэння падобных сістэм. Калі краіна гэтым займаецца, гэта сведчыць пра наяўнасць класных спецыялістаў і будучыні ў гэтай сферы. «У нас ёсць добрыя напрацоўкі, згубіць іх нельга. Тым больш што многія сістэмы, якія мы стварылі тут, у тым ліку закрытай сувязі, карыстаюцца павагай замежных дзяржаў», — падкрэсліў беларускі лідар. І для некаторых кіраўнікоў дзяржаў беларускія спецыялісты ўжо стварылі камунікацыі, аналагічныя прэзідэнцкім.

Акрамя таго, усё, што карыстаецца попытам, прыносіць немалыя грошы. Таму Аляксандр Лукашэнка даручыў удзельнікам нарады працаваць у гэтым кірунку і развіваць сістэмы «закрытай» сувязі.

Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Беларусі Станіслаў Зась расказаў журналістам пра вынікі работы на дадзеным кірунку: «Мы цалкам адышлі ад савецкай спадчыны: сістэма пабудавана на новай тэхналагічнай базе, выкарыстоўваецца выключна беларуская апаратура шыфравання. Тут трэба проста нарошчваць і ўдасканальваць тое, што ёсць».

Другі кірунак, які сёння патрабуе большых намаганняў, — мабільная абароненая сувязь. «Сакрэтнымі» сотавымі тэлефонамі ўжо карыстаюцца беларускія кіраўнікі. «Гэта новая справа для краіны. Некалькі гадоў таму мы з нуля пачалі ствараць школу кадраў, праводзіць навуковыя і тэхналагічныя распрацоўкі. Цяпер ужо этап тэставай эксплуатацыі «ў баявых умовах», — расказаў дзяржсакратар.

Моцны бок гэтай сувязі — бяспека камунікацыі, а вось над яе якасцю яшчэ належыць папрацаваць. Такую задачу на нарадзе паставіў кіраўнік дзяржавы.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Энергетыка

## БЕЛАРУСКУЮ АЭС ЗАПУСЦЯЦЬ У ПАЧАТКУ 2020-га

**Гэтыя і іншыя тэмы абмяркоўваліся на 20-м пасяджэнні Камісіі дзяржаў — удзельнікаў СНД па выкарыстанні атамнай энергіі ў мірных мэтах.**

— Налета завяршаецца дзеянне двух асноўных дакументаў, у межах якіх працуе Камісія. Гэта Рамачная праграма супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД у галіне мірнага выкарыстання атамнай энергіі да 2020 года «Супрацоўніцтва «АТАМ-СНД» і План мерапрыемстваў па яе рэалізацыі, — паведаміў **Міхаіл МІХАДЗЮК, намеснік міністра энергетыкі Беларусі.** — Эксперты падрыхтавалі праекты новых дакументаў, якія вызначаць работу Камісіі да 2025 года з перспектывай да 2030-га.

Учора ўдзельнікі пасяджэння Камісіі наведалі пляцоўку будаўніцтва атамнай станцыі і сам горад энергетыкаў Астравец. Гаворачы пра рэалізацыю сумеснага з Расіяй праекта па стварэнні АЭС, Міхаіл Міхадзюк адзначыў:

— На першым энергаблоку Беларускай АЭС вядуцца перадпускавыя аперацыі. На другім блоку нароўні з будаўнічымі работамі манціруецца асноўнае тэхнічнае абсталяванне. Кожная аперацыя, перадпускавая і пускавая, распісана спецыяльнымі праграмамі, якія нельга ні паскорыць, ні абысці. Таму што гэта тэхналагічны працэс. Сёння мы рыхтуемся да ключавога этапу ў графіку перадпускавых аперацый — выхаду на «гарачую абкатку».

Пасля паспяховага завяршэння гэтага этапу пачнуцца загрузка паліва і так званы фізічны запуск. Калі ўсё атрымаецца належным чынам, ён адбудзецца ў першым квартале 2020 года.

**Ірына СІДАРОК.**

# ААЭ ВЫБІРАЮЦЬ БЕЛАРУСЬ

## Беларусь чакае павелічэння арабскіх інвестыцый у сферы прамысловасці і сельскай гаспадаркі

**Прэзідэнт правёў рабочую сустрэчу са старшынёй савета дырэктараў кампаніі «Эмаар Проперціз» (Дубай). Сустрэча стала працягам тэм, узнятых на пачатку лістапада падчас візіту Аляксандра Лукашэнкі ў Аб'яднаныя Арабскія Эміраты.**

У ААЭ беларускі лідар і кіраўніцтва Эміратаў абмеркавалі шматлікія кірункі супрацоўніцтва, але Аляксандр Лукашэнка спецыяльна запрасіў Мухамеда Алі аль-Абара, каб больш канкрэтна пагаварыць пра работу «Эмаар Проперціз» на тэрыторыі Беларусі.

«Мы гатовы супрацоўнічаць з Эміратамі не толькі ў сферы інтарэсаў вашай кампаніі, але нашмат шырэй: у сферы прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Для нас гэта самыя важныя кірункі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Ён прапанаваў Мухамеду Алі аль-Абару абмеркаваць праекты, якія цяпер у распрацоўцы, але асаблівую ўвагу ўсё ж такі ўдзяліць праектам у рэальным сектары эканомікі.

Падчас візіту ў Эміраты, а таксама падчас візіту наследнага прынца ў Беларусь Аляксандру Лукашэнку спадабаўся шэраг ідэй, якія выказаў шэйх, у тым ліку ідэя самога аль-Абара. Беларускі лідар папрасіў госця перадаць самыя цёплыя і добрыя пажаданні, падзяку за ўсё, што зроблена падчас знаходжання Прэзідэнта ў Эміратах, наследнаму прынцу Абу-Дабі Мухамеду і кіраўніку Дубая шэйху Мактуму. У Беларусі іх заўсёды чакаюць, дадаў кіраўнік нашай краіны.

Першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Аляксандр Турчын паведаміў журналістам, што эмірацкі бок гатовы вельмі апэратыўна — літаральна за паўгода — мадэрнізаваць які-небудзь стары будынак у Мінску і пабудаваць гасцініцу сучаснага ўзроўню.

Гэта толькі адзін з вынікаў сустрэчы, на якой абмеркаваны цэлы шэраг магчымых інвестыцыйных праектаў — ад пытанняў сельскай гаспадаркі да прамысловасці і дэвелаперскіх праектаў. Па словах першага віцэ-прэм'ера, Прэзідэнт нават гатовы сустрэцца для абмеркавання рэалізацыі гэтых праектаў яшчэ раз, калі будзе такая неабходнасць.

«У «Эмаар Проперціз» прапановы ёсць з усяго свету, але яны выбралі для інвестыцый нашу краіну», — падкрэсліў Аляксандр Турчын.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Выбары: меркаванні

# СІСТЭМНА І ТРАНСПАРЭНТНА

**На парламенцкіх выбарах у складзе самай вялікай місіі назіральнікаў — ад Садружнасці Незалежных Дзяржаў — працавалі дэпутаты Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. Яны ахарактарызавалі выбары як адкрытыя, дэмакратычныя і легітымныя.**

**Арцём ТУРАЎ, член камітэта Дзяржаўнай думы па справах Садружнасці Незалежных Дзяржаў, еўразійскай інтэграцыі і сувязях з суайчыннікамі** расказаў, што ў складзе місіі былі дэпутаты Дзяржаўнай думы, члены Савета Федэрацыі, прадстаўнікі сакратарыята Парламенцкага сходу Беларусі і Расіі. Усяго 25 чалавек працавалі ў доўгатэрміновай і ў кароткатэрміновай місіі.

У дзень выбараў назіральнікі ад Парламенцкага сходу наведалі каля 160 участкаў у Мінску, Мінскай, Віцебскай, Гродзенскай абласцях.

«Па тых участках, дзе мы знаходзіліся, вельмі сістэмна, транспарэнтна праходзілі выбары. Мы не вызначылі ніякіх парушэнняў, якія б маглі паўплываць на выніку галасавання ці на волевыяўленне грамадзян, таму даём дастаткова высокую ацэнку выбарам дэпутатаў парламента. Чакаем нашых новых калег, якія далучацца да работы Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі», — сказаў Арцём Тураў.

У місіі назіральнікаў СНД была прадстаўлена і **Цэнтральная выбарчая камісія Казахстана**, прычым на самым высокім узроўні — **старшынёй Берыкам ІМАШАВЫМ.** У рэгіёнах Беларусі працавалі 76 казахстанскіх назіральнікаў, якія наведалі звыш 400 участкаў.

«Са справаздач нашых назіральнікаў вынікае, што выбары прайшлі арганізавана. Члены ўчастковых выбарчых камісій рабілі сваю работу прафесійна, разбіраліся ва ўсіх працэдурах, звязаных з арганізацыяй галасавання — падлікам галасоў, падвядзеннем вынікаў выбараў. Казахстанскімі назіральнікамі адзначаецца, што на большасці выбарчых участкаў былі створаны ўмовы для галасавання асоб з абмежаванымі магчымасцямі, і, што вельмі важна, — галасаванне праходзіла ў спакойнай, добразычлівай атмасферы», — падкрэсліў старшыня ЦВК Казахстана.

Па яго словах, сістэмных парушэнняў на ўчастках не было, а нязначныя недахопы не паўплывалі на волевыяўленне грамадзян.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Прэм'ер-міністр Канады прадставіў новы кабінет



У склад новага канадскага ліберальнага ўрада ўвайшлі 36 міністраў. Джасцін Трудо, па выніках сёлетніх выбараў, як і чатыры гады таму, сфарміраваў свой кабінет з улікам гендарнай роўнасці — палову складаюць жанчыны. Члены кабінета міністраў прынеслі прысягу на вернасць краіне і каралеве Вялікабрытаніі Лізавеце II, якая з'яўляецца кіраўніком Канады. Урачыстую цырымонію, што адбылася ў атаўскай рэзідэнцыі Рыдэ-Хол канадскага генерал-губернатара Жулі Пеет, транслявалі ўсе нацыянальныя тэлеканалы. «Сёння мы прадставілі новы кабінет міністраў і разумеем, што наперадзе нас чакае шмат работы, — сказаў Трудо па выніках цырымоніі прывядзення да прысягі новага кабінета міністраў. — Мы павінны аб'яднаць краіну, сфакусавацца на росце эканомікі, барацьбе са зменамі клімату і бяспецы канадцаў. Гэта нашы прыярытэты». Шэраг міністраў ранейшага ўрада атрымалі новыя пасады, акрамя таго, у кабінет увайшлі і новыя члены, заявіў Джасцін Трудо. На кастрычніцкіх выбарах у парламент Ліберальная партыя страціла абсалютную большасць і сфарміравала мінарытарны ўрад.

## ААН вызначыла 47 найменш развітых краін

Больш за 30 афрыканскіх краін, а таксама шэраг азіяцкіх і астраўных дзяржаў увайшлі ў спіс найменш развітых краін у свеце. Пра гэта гаворыцца ў Дакладзе па найменш развітых краінах Канферэнцыі ААН па гандлі і развіцці (ЮНКТАД). Спіс уключае 47 дзяржаў. У асноўным гэта афрыканскія краіны, у тым ліку Ангола, Бенін, Буркіна-Фасо, Бурундзі, ЦАР, Чад, Дэмакратычная Рэспубліка Конга, Джыбуці, Эрытрэя, Эфіопія, Гамбія, Мадагаскар, Малі, Судан, Паўднёвы Судан, Уганда, Замбія і іншыя. У спісе таксама апынуліся астраўныя дзяржавы Акіяніі: Кірыбаці, Тувалу, Вануату, Саламонавы Астравы. У трэцюю групу — азіяцкія краіны — увайшлі Афганістан, Бангладэш, Камбоджа, Лаос, М'янма, Непал, Емен і Бутан. «Мы аналізуем усе краіны на падставе трох крытэрыяў, — растлумачыла ТАСС прадстаўнік ЮНКТАД Шанталь Карпенцье. — Па-першае, гэта даход на душу насельніцтва, тут разглядаюцца краіны з гэтым паказчыкам ніжэй за 1230 долараў. Таксама аналізуем крытэрый слабасці людскіх рэсурсаў на аснове паказчыкаў харчавання, здароўя, адукацыі і пісьменнасці дарослага насельніцтва і крытэрый эканамічнай уразлівасці — гэта значыць схільнасці да кліматычных, сельскагаспадарчых, эканамічных і іншых катаклізмаў». За ўсю гісторыю складання даклада адмоўны рэйтынг удалося пакінуць пяці краінам — Батсване, Каба-Вердэ, Экватарыяльнай Гвінеі, Мальдывам і Самоа.



## Оксфардскі слоўнік назваў «надзвычайную кліматычную сітуацыю» словам года

Оксфардскі слоўнік англійскай мовы назваў «climate emergency» словам 2019 года, паведамляе газета New York Times. У шорт-ліст таксама ўвайшлі «барацьба са зменай клімату» (climate action), «кліматычнае адмаўленне» (climate denial), «эка-трывожнасць» (eco-anxiety), «выміранне» (extinction) і «лётаць сорамна» (flight shame). Патэнцыйна гэтымі словамі могуць стаць культура значныя тэрміны. Нядаўнімі пераможцамі ў гэтай катэгорыі сталі «таксічны» (toxic), «моладзетрасенне» (youthquake), «пост-праўда» (post-truth) і «вейп» (vape). «Калі мы праглядалі факты, было відавочна, што пытанні, звязаныя з кліматам, праходзілі праз усе лексічныя адзінкі, з якімі мы працавалі», — адзначыла рэдактар Оксфардскага слоўніка Кэтрын Конар Марцін. Выкарыстанне тэрміна «climate emergency» ў сотні разоў павялічылася з 2018 года, сведчаць даныя, сабраныя базай, якая ўключае ў сябе сотні мільёнаў англійскіх слоў. Яно сустракаецца ў тры разы часцей, чым «надзвычайная сітуацыя ў галіне аховы здароўя».

Нашы святыні

# ДА СВЯТА ДУХОЎНАСЦІ І ВЕРЫ

**Жыровіцкі Свята-Успенскі мужчынскі манастыр рыхтуецца адзначыць уласны 500-гадовы юбілей і 550-годдзе з'яўлення цудатворнай Жыровіцкай іконы Божай Маці. Як плануецца, ключавыя ўрачыстасці пройдуць на Гродзеншчыне і ў Мінску 19—20 мая 2020 года.**


Фота БелТА.

«Падзея, якую мы будзем адзначаць налета, важная не толькі для вернікаў, але і ў цэлым для беларусаў, бо цудатворная ікона Божай Маці — адна з найвялікшых святыняў і духоўных сімвалаў нашага народа», — падкрэсліве **выкладчык Мінскай духоўнай семінарыі і насельнік Жыровіцкага манастыра іераманах Яўстафій ХАЛІМАНКОЎ.**

Сярод высокіх гасцей на ўрачыстае богаслужэнне чакаюць у тым ліку кіраўніка Рускай праваслаўнай царквы, Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла. Запрашэнне накіраванае таксама кіраўніку нашай дзяржавы Аляксандру Лукашэнку. Не выключаюць арганізатары і ўдзелу першых асоб суседніх краін.

А цяпер, па словах памочніка архіепіскапа Навагрудскага і Слонімскага Аляксандра Сцяжко, працягваюцца сумесныя работы дзяржавы і Беларускай праваслаўнай царквы па прывядзенні манастыра ў належны выгляд. Так, зусім нядаўна здадзены ў эксплуатацыю новая трапезная і гасцініца для паломнікаў, зараз ідзе рэканструкцыя з элементамі рэстаўрацыі аднаго з найстарэйшых будынкаў — першага брацкага корпуса, адліваецца набор новых званоў для манастыра, рамонт і добраўпарадкаванне чакаюць і сам аграгарадок Жыровіцы. У планах — устаноўка помніка аднаму з настаяцеляў манастыра Серафіму Жыровіцкаму, дзякуючы місіянерскай дзейнасці якога ва Усходняй Беларусі былі адкрыты 74 храмы.

Рыхтуюцца да свята і студэнты і выкладчыкі Мінскай духоўнай семінарыі, якая размешчана ў манастыры, і духоўнай акадэміі, што знаходзіцца ў Мінску. Гэтыя навучальныя ўстановы рыхтуюць не толькі будучых святароў, але і даследчыкаў, і ў 2020 годзе акумулююць увесь свой навуковы патэнцыял для правядзення міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 500-гадовай гісторыі Жыровіцкай абіцелі, — цягам двух дзён удзельнікі канферэнцыі будуць працаваць на базе духоўнай семінарыі і акадэміі, Інстытута гісторыі і Інстытута філасофіі НАН Беларусі. На лістапад будучага года запланаваны семінар студэнтаў і маладых вучоных з беларускіх ВНУ, якія таксама абмяркуюць гісторыю манастыра, яго ролю і значэнне праваслаўнай царквы ў гісторыі і культуры Беларусі.

Падчас святкавання акцэнт зробяць не толькі на слаўнай гісторыі абіцелі, але і на яе сучаснай ролі ў жыцці беларускага грамадства. У Мінску і абласных цэнтрах будуць зладжаны шматлікія круглыя сталы, навукова-практычныя канферэнцыі, творчыя конкурсы і выстаўкі, плануецца стварыць цыкл тэматычных тэле- і радыёпраграм.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

# На сцэну — разам з зоркай...

**У кожнага з нас ёсць мара. І вельмі важна, каб яна спраўдзілася. Мара выйсці на сцэну, праспяваць, станцаваць, паказаць свой талент — ласцівая многім дзецям. Каб яе ажыццявіць, у Мінску ўжо дванаццаты раз прайшоў Рэспубліканскі фестываль творчасці выхаванцаў дамоў-інтэрнатаў для дзяцей-інвалідаў «Мары спраўджваюцца».**

У ім узялі ўдзел выхаванцы дзевяці дамоў-інтэрнатаў для дзяцей і маладых людзей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, што выступілі на адной сцэне з прафесіяналамі, зоркамі беларускай эстрады, такімі як Аляксандр Саладуха, Аляксандр Патліс, Дзядзька Ваня, Алёна Ланская, Яўген Курчыч. У конкурснай праграме былі прадстаўлены самыя розныя жанры: песні, танцы, тэатральныя мініяцюры, прамоўніцкае мастацтва і іншыя.

— Гэты фестываль — добры прыклад інклюзіі, сацыяльнай інтэграцыі дзяцей з інваліднасцю ў наша грамадства, — сказаў **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК.** — Колькасць дзяцей з інваліднасцю ў нашай краіне, на жаль, расце. Але пры гэтым колькасць такіх дзяцей, якія пражываюць у інтэрнатных установах, скарачаецца. Усё больш іх жыве ў хатніх умовах. Гэта вельмі важна для кожнага дзіцяці. А для тых, хто ўсё ж жыве не ў сям'і, мы стараемся даць магчымасць рэалізаваць свае імкненні і мары...

Сёння ў нашай краіне функцыянуе дзевяць дамоў-інтэрнатаў для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, у якіх пражываюць 1375 выхаванцаў. Гаворка ідзе пра дзяцей і маладых людзей з інваліднасцю, якія маюць цяжкія і множныя парушэнні, выкліканыя рознымі захворваннямі. Хлопчыкі і дзяўчынкі ў гэтых установах атрымліваюць спецыяльную адукацыю, набываюць сацыяльныя і працоўныя навыкі...

Пры гэтым калі раней такія дзеці пры дасягненні паўналецця, як правіла, перамяшчаліся ў дарослыя дамы-інтэрнаты, то пачынаючы з 2013 года пры дзіцячых дамах-інтэрнатах развіваюцца паслугі суправаджаемага пражывання, калі выхаванцаў інтэрнатаў, якія маюць псіхічныя адхіленні, рыхтуюць да будучага самастойнага жыцця: вучаць гатаваць, прыбіраць, планаваць бюджэт і іншым патрэбным у штодзённым жыцці навыкам.

**Святлана БУСЬКО.**

# БАНКІ, ЯКІМ МОЖНА ДАВЯРАЦЬ

**Нацыянальны банк Беларусі вызначыў пералік сістэмна значных банкаў на 2020 год, паведамілі ў прэсслужбе фінансавага рэгулятара краіны.**

Да групы сістэмнай значнасці I аднесены акцыянерныя таварыствы «Беларусбанк», «Белаграпрамбанк», «Белгазпрамбанк», «БПС-Ашчадбанк», «Пріорбанк», «Банк БелВЭБ» і «Белінвестбанк». Да групы сістэмнай значнасці II аднесены такія фінансавыя інстытуты, як «Альфа-Банк», «Банк ВТБ (Беларусь)», «МТБанк», «Банк Дабрабыт» і «Парытэтбанк».

«Гэтыя банкі аднесены да ліку сістэмна значных на падставе агрэгаванай ацэнкі іх сістэмнай значнасці па такіх паказчыках, як маштаб дзейнасці банка, яго ўзаемазвязанасць з банкамі-рэзідэнтамі, значнасць для эканомікі і ўзаемазвязанасць з нерэзідэнтамі», — патлумачылі сваю пазіцыю ў Нацбанку. Гэтыя паказчыкі разлічаны ў адпаведнасці з патрабаваннямі інструкцыі аб парадку вызначэння сістэмна значных банкаў.

На працягу наступнага каляндарнага года банкам, аднесеным да ліку сістэмна значных, неабходна забяспечыць выкананне нарматываў дастатковасці нарматыўнага капіталу, значэнне якіх вызначаецца з улікам буфера сістэмнай значнасці. Акрамя таго, у названых банках саветамі дырэктараў з ліку іх членаў і работнікаў адпаведных банкаў трэба сфарміраваць камітэты па ўзнагароджаннях, якія павінны ўзначальваць незалежныя дырэктары.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ТАК АДЗНАЧЫЛІ ПРОВАДЫ Ў АРМІЮ, што разнеслі здымны дом

**У Гродне група маладых людзей з размахам адзначыла провады прыяцеля ў войска. З гэтай нагоды знялі прыватны дом, а колькасць гасцей была за два дзясяткі, прычым у працэсе святкавання яны прыбывалі.**

Зранку ў жылое памяшканне прыйшла гаспадыня і вачам сваім не паверыла, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама. Унутры быў форменны вэрхал, разбіта частка вокнаў, зламаны таршэр, прапаў пыласос, а частка рэчаў з дома плавала ў штучнай сажалцы. Раззлаваная жанчына вырашыла звярнуцца ў міліцыю, і ўжо супрацоўнікі органаў унутраных спраў сталі разбірацца, што адбылося.

З кампаніі тых, хто адпачываў, як высветлілася, па зразумелых прычынах ніхто толкам нічога не памятае, але шкадуе аб тым, што здарылася. Сваімі сіламі яны спрабавалі адшукаць у сажалцы зніклы пыласос, нават ныралі, але бытавая тэхніка аказалася ў аднаго з удзельнікаў застолля. Як — зноў жа ніхто не памятае.

Зараз дзеяннем усіх датычных да падзей, што мелі месца быць, даецца прававая ацэнка. Арганізатар вечарыны кампенсаваў гаспадыні частку шкоды, у тым ліку страчаныя сродкі ад планаванай здачы катэджа на наступныя суткі іншым людзям. Пасля адпачынку моладзі жыллё аказалася проста непрыдатным для камфортнага знаходжання ў кароткатэрміновай перспектыве.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Блізкая ўлада

# ТЭЛЕФАНУЙЦЕ Ў СУБОТУ

**У суботу, 23 лістапада, з 9.00 да 12.00 кіраўнікі абласной вертыкалі правядуць традыцыйныя прамыя лініі. У гэты час на сувязі будуць:**

* намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Андрэй Анатолевіч КЛЕЦ. Тэл. (8 0162) 21 31 21;

* старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Мікалаевіч ШАРСНЁЎ. Тэл. (8 0212) 22 22 22;

* намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. (8 0232) 33 12 37;

* намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. (8 0152) 73 56 44;

* першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Васіль Іванавіч АКУЛІЧ. Тэл. (8 0222) 50 18 69;

* намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Мікалай Міхайлавіч РАГАШЧУК. Тэл. (8 017) 500 41 60;

* старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Васіль Васілевіч ПАНАСЮК Тэл. (8 017) 222 44 44.

# БЯСПЕКА ДЗЯЦЕЙ — НА ДЗЯРЖКАНТРОЛІ

**У Камітэце дзяржаўнага кантролю, а таксама ў камітэтах дзяржаўнага кантролю абласцей арганізаваны гарачыя лініі па пытаннях функцыянавання ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.**

Грамадзяне могуць паведаміць пра магчымыя парушэнні і недахопы ў арганізацыі бяспечнага знаходжання дзяцей у школах па наступных тэлефонах:

Брэсцкая вобласць — 8 (0162) 21 18 76;

Віцебская вобласць — 8 (0212) 37 61 53;

Гомельская вобласць — 8 (0232) 23 83 85, 23 83 68;

Гродзенская вобласць — 8 (0152) 79 88 40, 79 88 18, 79 88 19;

Магілёўская вобласць — 8 (0222) 62 48 97, 62 41 94, 62 54 22;

Мінская вобласць — 8 (017) 331 64 59;

Мінск — 8 (017) 328 66 83, 328 59 09.

Інфармацыю на гарачыя лініі можна паведаміць да 16 снежня 2019 года.

Створана міжведамасная рабочая група, а таксама рабочыя групы ў рэгіёнах краіны, у склад якіх увайшлі прадстаўнікі Камітэта дзяржкантролю, Міністэрства адукацыі, Міністэрства аховы здароўя, Мінжылкамгаса, МУС, МНС, Дзяржстандарту і іх тэрытарыяльных падраздзяленняў. У найбліжэйшы час спецыялісты правядуць праверкі ўмоў знаходжання дзяцей у школах. Ці адпавядаюць яны дзейным дзяржаўным стандартам?

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Надвор'е

# Вось і падмарозіць не на жарт

## У нядзелю ўначы «прыпячэ» да мінус 13 градусаў

**Калі сёння чакаецца пераменная воблачнасць, а максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе ад мінус 5 градусаў па ўсходзе да плюс 2 градусаў па захадзе краіны, то ў выхадныя чакаецца істотнае пахаладанне, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**


Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

Чакаецца, што 23 і 24 лістапада наша краіна будзе знаходзіцца на перыферыі малярухомага арктычнага антыцыклону з цэнтрам над сярэдняй Волгай. Заўтра ўдзень будзе воблачна з праясненнямі. Пераважна без ападкаў, толькі раніцай і ўдзень у асобных раёнах па захадзе нашага рэгіёна пройдуць невялікія кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Месцамі — слабы галалёд. Вецер паўднёва-ўсходні парывісты. Мінімальная тэмпература паветра ўначы будзе вар'іравацца ад мінус 2 градусаў па захадзе да мінус 12 градусаў па ўсходзе краіны. Удзень чакаецца таксама марознае надвор'е, калі максімальная тэмпература будзе ад нуля да мінус 6 градусаў.

У нядзелю — воблачна з праясненнямі, пераважна без ападкаў, толькі ўначы ў асобных раёнах Гродзенскай вобласці пройдуць невялікія кароткачасовыя ападкі (дождж, мокры снег), з'явіцца слабы галалёд. Вецер паўднёва-ўсходні ўмераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 градусаў да мінус 10 градусаў, месцамі чакаецца паніжэнне да 11—13 марозу. Максімальная тэмпература паветра ўдзень чакаецца ад нуля да мінус 6 градусаў. У гэты час на захадзе краіны будзе значна цяплей: уначы — 2—3 марозу, удзень — 1—2 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Юбілеі

# СПЛАЎ ТРАДЫЦЫЙ, МАЛАДОСЦІ І ІНАВАЦЫЙ



**За 105 гадоў існавання Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта тут было падрыхтавана каля 180 тысяч педагогаў, з іх больш за 500 заслужаных настаўнікаў і дзеячаў навукі, больш за 100 дактароў і 1500 кандыдатаў навук, больш за 100 членаў Саюза пісьменнікаў.**

Толькі за апошнія пяць гадоў супрацоўнікі БДПУ абаранілі 108 кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Пра гэта на ўрачыстым пасяджэнні ўніверсітэта паведаміў яго **рэктар, доктар педагагічных навук, прафесар Аляксандр ЖУК.** Сёння ў БДПУ навучаецца звыш 14 тысяч чалавек, у тым ліку 1350 іншаземцаў з 22 краін свету. Працуюць 764 выкладчыкі.

Ва ўніверсітэце рэалізуецца каля 155 адукацыйных праграм на розных ступенях адукацыі. Паспяхова ўкараняюцца новыя адукацыйныя тэхналогіі (інтэрактыўныя, гульнявыя), тэхналогіі праектнага і модульнага навучання.

У 2015 годзе на базе БДПУ быў створаны вучэбна-навукова-інавацыйны кластар бесперапыннай педагагічнай адукацыі. Сёння ва ўніверсітэце дзейнічаюць Рэсурсны цэнтр сацыяльна-педагагічных тэхналогій, Рэсурсны цэнтр інклюзіўнай адукацыі, Рэспубліканскі рэсурсны цэнтр адукацыйнай робататэхнікі, Рэспубліканскі цэнтр псіхалагічнай дапамогі.

Сёлетняя прыёмная кампанія паказала, што ўніверсітэт вельмі папулярны сярод выпускнікоў: сярэдні конкурс па ВНУ склаў каля 2,5 чалавека на месца. З году ў год растуць прахадныя балы, павялічваецца сярод абітурыентаў колькасць медалістаў і ўладальнікаў дыпломаў з адзнакай. Калі ў 2013 годзе іх было толькі 20 чалавек, то ў 2018 годзе — 185. А сёлета амаль палова першакурснікаў у БДПУ — медалісты і ўладальнікі дыпломаў ССНУ з адзнакай, выпускнікі педкласаў. Варта адзначыць, што з кожным годам ва ўніверсітэт паступае ўсё больш юнакоў. Так, на факультэтах фізічнага выхавання і гістарычным хлопцы складаюць 60 % ад агульнай колькасці першакурснікаў. На фізіка-матэматычным факультэце — 40 %.

У БДПУ шырока развіты валанцёрскі рух. Кожны год 1400 студэнтаў задзейнічаны ў валанцёрскіх атрадах, удзельнічаюць у правядзенні мерапрыемстваў і акцый на рэспубліканскім ўзроўні. 400 актыўных студэнтаў БДПУ сталі валанцёрамі II Еўрапейскіх гульняў. У 2017 годзе Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за значны ўнёсак у развіццё і папулярызацыю валанцёрскага руху сярод студэнцкай моладзі калектыў універсітэта быў узнагароджаны прэміяй «За духоўнае адраджэнне».

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў БДПУ са 105-годдзем з дня заснавання ВНУ.

«Перасягнуўшы векавую мяжу, універсітэт працягвае заставацца сплавам вопыту і маладосці, традыцый і інавацый. Ваш калектыў актыўна працуе на карысць айчыннай адукацыі, умацоўваючы падмурак устойлівага развіцця грамадства і дзяржавы», — гаворыцца ў віншаванні.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў важкі ўнёсак калектыву ВНУ ў папулярызацыю і павышэнне прэстыжу прафесіі педагога. «Перакананы, што гатоўнасць думаць і дзейнічаць у адпаведнасці з патрабаваннямі часу дазволіць вам і ў далейшым паспяхова вырашаць важныя задачы па падрыхтоўцы высокапрафесійных спецыялістаў, здольных выхоўваць сапраўдных патрыётаў сваёй краіны», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

**Надзея НІКАЛАЕВА,**
**фота аўтара.**

**ОАО «Амкодор-Белвар»**
**220005, г. Минск, проспект Независимости, 58.**
**Извещение о проведении внеочередного общего собрания акционеров**

Собрание состоится 24 декабря 2019 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, проспект Независимости, 58, зал заседания Общества (корпус № 30, 3-й этаж).

Орган, созывающий собрание акционеров, – Совет директоров ОАО «Амкодор-Белвар».

Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 14.00 до 14.55.

Регистрация лиц, имеющих право на участии в собрании, осуществляется при предъявлении ими документов, подтверждающих их личность и полномочия. При регистрации акционеры предъявляют документ, удостоверяющий личность; представители акционеров предъявляют документ, удостоверяющий личность, и подтверждают свои полномочия надлежащим образом оформленной доверенностью (договором) (руководители юридических лиц – акционеров – документом, подтверждающим статус руководителя).

**Повестка дня**

1. Избрание членов Совета директоров ОАО «Амкодор-Белвар».
2. Утверждение размера вознаграждения членам Совета директоров ОАО «Амкодор-Белвар».

Ознакомление лиц, имеющих право на участие в собрании, с информацией (документами), предоставляемой при подготовке к проведению собрания, осуществляется ежедневно (кроме субботы и воскресенья), начиная с 25 ноября 2019 г. в отделе кадров ОАО «Амкодор–Белвар» по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 58, с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Совет директоров ОАО «Амкодор-Белвар».

УНП 100363840

Ну і ну!

## ЦЯЛУШКІ Ў МІКРААЎТОБУСЕ

**У Рагачоўскім раёне затрымалі аўтатранспарт з выкрадзенымі рагулямі. Абедзвюм жывёлам «прырабілі ногі» ноччу, паведамляе УУС Гомельскага аблвыканкама.**

Двое жыхароў Рагачоўскага раёна 1990 і 1983 гадоў нараджэння з 46-гадовым жыхаром Жлобіна выехалі на ферму ў вёску Іскань Быхаўскага раёна. Там з кароўніка вывелі дзвюх цялушак агульнай вагой 900 кілаграмаў і пагрузілі іх у спецыяльна абсталяваны для гэтых мэт мікрааўтобус «Фальксваген LT». Пасля чаго рушылі ў бок Рагачова. У 2.30 ночы аўтамашына была спынена супрацоўнікамі міліцыі каля вёскі Званец Рагачоўскага раёна. Рэйдавая група праваахоўнікаў адпрацоўвала Журавіцкі і Званецкі сельсаветы на прадмет прафілактыкі крадзяжоў з сельгаспрадпрыемстваў. Выкрадзеная буйная рагатая жывёла была вернута гаспадарцы. У дачыненні да падазраваных распачата крымінальная справа за крадзеж, учынены групай асоб. Ім пагражае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі да чатырох гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ВЫЙСЦІ З «НЕБЯСПЕЧНАЙ ГУЛЬНІ»



***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

У апошнім выпадку чалавек мае права не адкрываць свой наркалагічны статус, а атрымаць медыцынскую дапамогу ананімна, і гэта, як лічыць Жанна Істоміна, вялікі плюс, асабліва для тых, хто яшчэ сацыялізаваны, не страціў сувязі з грамадствам і можа выконваць свае сацыяльныя функцыі.

Першую дапамогу наркаспажыўцы атрымліваюць амбулаторна. Кабінеты ў Мінску размяшчаюцца па 18 адрасах, і ў хуткім часе будзе адкрыты 19-ы. У наяўнасці шэсць стацыянарных аддзяленняў, дзе нарказалежныя могуць прайсці праграму дэтоксу (так званае зняцце ломкі). Працуюць і чатыры кабінеты, спецыяльна вылучаныя для прыёму наркаспажыўцоў, па вуліцах Маякоўскага і Перадавой. Там пацыенты атрымліваюць дапамогу на амбулаторным этапе: прыём урача-нарколага, які прызначае лячэнне, а таксама кансультацыю псіхолага.

Калі не дапамагае амбулаторнае лячэнне, пацыенту прапануюць стацыянарнае. Калі яно праходзіць паспяхова, нарказалежнага чакае рэабілітацыя. У сталічным наркадыспансеры працуюць дзве кароткатэрміновыя праграмы, разлічаныя на 28—30 дзён. Адна з іх ананімная платная — «Вясёлка», якая дзейнічае ўжо больш за дзесяць гадоў.

**Працэс аднаўлення ўключае медыцынскую частку і сацыяльную. Пасля выпіскі са стацыянара з пацыентам працягваюць займацца спецыялісты сацыяльных і іншых службаў.**

— Гэта адна з самых першых праграм рэабілітацыі наркаспажыўцоў у Беларусі. У нас вялікі вопыт, і вывучаць нашы рэабілітацыйныя праграмы прыязджаюць нават калегі з Расіі. На сённяшні дзень паказчык рэмісіі (невяртання да наркаспажывання на працягу трох гадоў) у нас большы за 40 %. Гэта добрая лічба нават у сусветным маштабе, бо па звестках Сусветнай арганізацыі аховы здароўя не вяртаюцца на працягу жыцця да наркотыкаў да трох да дзесяці працэнтаў былых нарказалежных, — кажа Жанна Істоміна. — Таму добра, што хоць на нейкі тэрмін у нас атрымліваецца вярнуць наркаспажыўцоў у грамадства.

Другая праграма бясплатная — для тых, хто знаходзіцца на ўліку. З пацыентамі тут таксама працуюць псіхолагі, псіхатэрапеўты, якія вучаць жыць без псіхаактыўных рэчываў.

— Для людзей, якія паспрабавалі ўсе віды лячэння і нічога не дапамагло, якія не могуць сысці ад вулічных наркотыкаў (гэта так званыя інкурабельныя пацыенты), у нас ужо больш за дзесяць гадоў працуе праграма замяшчальнай метадонавай тэрапіі. Цяпер у Мінску працуюць два кабінеты: па вуліцах Маякоўскага і Перадавой. Мы літаральна стаім на парозе адкрыцця трэцяга кабінета па праспекце газеты «Праўда».

Сёння ў праграме замяшчальнай тэрапіі ў Мінску задзейнічана каля 150 чалавек. За час яе работы пацыенты выходзілі замуж і жаніліся, аднаўлялі былыя сем'і, яны працуюць, нараджаюць дзяцей. Адна з умоў уключэння і знаходжання ў праграме для носьбітаў ВІЧ — прымаць антырэтравірусныя (АРВ) прэпараты. Сярод наркаспажыўцоў назіраецца рост ВІЧ-інфекцыі. Але ўсе пацыенты з ВІЧ у метадонавай праграме знаходзяцца і на АРВ-тэрапіі.

— У грамадстве, на жаль, ёсць пэўная стыгма. У нас праблемы з мясцовым насельніцтвам (у месцах, дзе знаходзяцца наркалагічныя кабінеты. — «**Зв**».). Нашы пацыенты гаварлівыя, шумныя — у іх такі псіхатып. І многім навакольным здаецца, што яны знаходзяцца ў ап'яненні, што яны збіраюцца зрабіць нешта дрэннае. Нам перыядычна паступаюць скаргі. Па адным з нашых адрасоў жыхары нават устанавілі некалькі камер для кругласутачнага назірання за нашымі пацыентамі. Але наверсе, у нашых пацыентаў зніжаецца колькасць праваправарушэнняў. Мы адводзім іх ад вулічных наркотыкаў, і яны не здзяйсняюць злачынствы. Лічу, што такая праграма павінна працаваць як адзін з варыянтаў сацыялізацыі і рэсацыялізацыі пацыентаў, якія маюць наркатычную залежнасць, — падкрэсліла Жанна Істоміна.

Кароткатэрміновыя рэабілітацыйныя праграмы існуюць і ў рэгіёнах — ва ўсіх абласных цэнтрах. Больш доўгая праграма мацыма ў РНПЦ псіхічнага здароўя, дзе нядаўна адкрыўся эксперыментальны цэнтр працяглай рэабілітацыі нарказалежных. Працэс аднаўлення ўключае медыцынскую частку і сацыяльную. Пасля выпіскі са стацыянара з пацыентам працягваюць займацца спецыялісты сацыяльных і іншых службаў.

Як адзначае **начальнік галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алег ТАКУН**, людзям з нарказалежнасцю аказваюць сацыяльныя паслугі, а таксама дапамагаюць у працаўладкаванні. У аказанні сацыяльных паслуг задзейнічаны тэрытарыяльныя цэнтры, дзе можна атрымаць бясплатную кансультацыю юрыста і псіхолага.

— Пытанне працаўладкавання дазваляе ацаніць паспяховасць рэсацыялізацыі людзей з нарказалежнасцю. Нашу работу будуем на добраахвотным заяўляльным прынцыпе. Кожны можа звярнуцца ў службу занятасці. Калі навыкі прафесіі не страчаны, мы акажам дапамогу ў працаўладкаванні, можам дапамагчы атрымаць новую спецыяльнасць. Усе паслугі аказваюцца бясплатна. Сёлета да нас звярнулася дзевяць чалавек, якія прайшлі лячэнне ад нарказалежнасці, чатыры з іх працаўладкаваны.

Як дадала Жанна Істоміна, урад прыняў адпаведную пастанову, згодна з якой падыход да працаўладкавання былых нарказалежных стаў больш лаяльны. Калі раней такі чалавек не мог уладкавацца на многія віды работ, то цяпер сітуацыю з кожным разглядаюць індывідуальна.

Канцэпцыя змякчэння антынаркатычных артыкулаў, у прыватнасці ў дачыненні да непаўналетніх, пакуль абмяркоўваецца. Тым не менш існуючае заканадаўства прадстаўнікі МУС лічаць эфектыўным.

— Тыя меры, якія прымаліся па стабілізацыі абстаноўкі і недапушчэнні распаўсюджання наркотыкаў, аказаліся эфектыўнымі. Заканадаўства дазваляе нам уносіць у пералік забароненых усе новыя наркотыкі, якія з'яўляюцца: 98 % наркотыкаў, якія ёсць у свеце, забаронены ў нас, у Беларусі. Закупляюцца сучасныя прыборы і прэпараты, якія дазваляюць выразна выяўляць забароненыя рэчывы ў біялагічных асяроддзях. Усё гэта дапамагае стварыць парог і не дапусціць забароненыя рэчывы ў Беларусь, — лічыць **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Міністэрства ўнутраных спраў Андрэй САЛАДОЎНІКАЎ.**

**За 10 месяцаў гэтага года ў падраздзяленні Следчага камітэта паступіла 4204 паведамленні аб злачынствах, звязаных з незаконным абаротам наркотыкаў. Заведзена 3946 крымінальных спраў па артыкуле 328. У суд за гэты перыяд накіравана 1423 крымінальныя справы па гэтым артыкуле. Сёлета да адказнасці прыцягнута 1870 чалавек, 968 утрымліваецца пад вартай, у тым ліку 28 непаўналетніх.**

**Алена КРАВЕЦ.**




## ДАРУЧЭННЕ З САКРЭТАМ

Што такое юбілей — хоць чалавека, хоць прадпрыемства — не мне вам казаць. Да свята яшчэ колькі тыдняў, а калектыў ужо на вушах, бо хочацца ж, каб усё атрымалася, каб людзі запомнілі, а таму...

Напярэдадні шасцідзесяцігоддзя на нашым прадпрыемстве ўзняўся сапраўдны гармідар. Супрацоўнікі бегалі за начальнікамі аддзелаў, тыя — за намеснікамі дырэктара, намеснікі — за ім самім... Пісаўся і перапісваўся сцэнарый, «выбіваліся» грошы, складаліся вось спісы гасцей...

Над гэтым, апошнім, пунктам я — тады старшыня прафкама — карпела некалькі дзён: уносіла ў спісы ўсіх заслужаных-адзначаных-узнагароджаных, некага выкрэслівала, зноў дапісвала... Адных былых дырэктараў назбіралася амаль на старонку, якую ўрэшце я аддала сакратарцы — для ўзгаднення з начальствам.

І вось сяджу неяк на сваім рабочым месцы, пазіраю на гадзіннік (у абед наважылася ў суседнюю краму), як раптам званок з прыёмнай: мяне кліча шэф, прычым тэрмінова.

Заходжу. Сяргей Іванавіч (назавём яго так) жэстам запрашае сесці, а сам круціць у руках нейкую паперку — здаецца, той самы спіс «былых генеральных»?

І сапраўды, бо кажа, што ўсё ў ім добра, але ж (даслоўна): «У мяне да вас вялікая просьба: калі будзеце тэлефанаваць вось гэтаму таварышу (дырэктар пазначыў фламастарам адно з прозвішчаў), то, калі ласка, запрасіце яго так... каб ён не прыйшоў!»

На маім твары адбілася, мусіць, зашмат нейкіх эмоцый. Сяргей Іванавіч нават прыпыніў, але ж тлумачыць нічога не стаў. Спытаў:

— Вам усё зразумела?

— Усё! — бадзёра адказала я і выйшла з кабінета.

Увесь той дзень, вечар і нават ноч з галавы не выходзіла гэта дзіўнаватае даручэнне. Ды і назаўтра, на паслязаўтра... Я злавалася на сябе, на калег (бо ў іх быў цудоўны настрой — яны рыхтаваліся да свята), на Сяргея Іванавіча, думала пра сваё двухсэнсоўнае становішча...

І вось нарэшце (адкладваць не было куды) тэлефаную таму былому дырэктару.

— Дазвольце, — пачынаю з месца ў кар'ер, — запрасіць вас на юбілей роднага прадпрыемства!

— Дазваляю, — паблажліва адказвае мне спадар Балбатуновіч (як звалі яго за вочы). — Запрашайце!

Ну мяне і панесла... Я сказала, што свята ладзім за горадам, у прыватным атэлі. Што дабірацца туды будзем на аўтобусе і, на жаль, невялікім... З мэтай эканоміі...

— Во... Дажыліся! — пачуўшы гэта, узрадаваўся (!) мой суразмоўнік. — А калі я быў дырэктарам...

Аб гэтым (мяне папярэдзілі) ён можа расказваць да раніцы, калі слова даць. Таму я, набраўшыся нахабства, стала гнуць сваё: ну, што ад'язджаць плануем у пяць гадзін вечара, а вяртацца, можа, і пад раніцу. Што ў праграме — конкурсы з пераапрананнямі, актыўныя гульні на свежым паветры, лазня і начная дыскатэка...

— До, — спыняе мяне былы генеральны. — Я ўжо не танцую. Так што давайце без мяне... Сустрэнемся іншым разам.

Я спрабую дзеля прыліку пашкадаваць, але ён кладзе трубку. А значыць, ура: справа, здаецца, зроблена?!

З той радасці я кірую ў кабінет генеральнага. Той адразу ж:

— Ну... Пагаварылі з Віктарам Пятровічам?

— Так.

— І што?..

— Ён падзякаваў і сказаў, што прыйдзе...

Вочы ў шэфа, бачу, акругліліся, бровы ўзняліся... Выгляд стаў настолькі разгублены, што я тут жа даравала яму ўсе свае хваляванні і спешна дадала:

— ...Але ж іншым разам.

— Вы ўпэўнены? — перапытаў шэф.

— Як у самой сабе, — адказала я, і гэта была чыстая праўда.

...За той месяц па выніках работы нам выдалі чарговую прэмію. І мая, трэба сказаць, аказалася чамусьці большай, чым звычайна. Можа, проста да юбілею грошай падкінулі, а можа...

**Ірына М.,**

*г. Мінск.*

## РАЗЛІК «ПА-ДАРОСЛАМУ»

...Шмат хто помніць сваю першую настаўніцу, першае каханне, спатканне, пацалунак, а я — і, відаць, да скону — буду помніць свой першы заробак.

Мне тады было гадоў, можа, пяць ці шэсць. Факт, што чытаць яшчэ не ўмеў, але ж да бабулі хадзіў самастойна, хоць жыла яна ў іншым канцы мястэчка. Гэта вярсты за дзве, калі ісці па вуліцах, а калі напрасткі, праз поле...

Шлях мы звычайна зразалі з мамай, а тут я адважыўся сам. Іду па вузенькай сцежцы і раптам бачу, што на ўзбочыне, у траве, нешта чарнееца. Кашалёк! Ды такі аб'ёмны...

Я тут жа адкрыў яго, зазірнуў ва ўсе кішэнькі і зусім расстроіўся, бо грошай там амаль не было, а вось нейкіх непатрэбных папер — хоць адбаўляй.

Пакруціў я іх у руках, паднёс да блізкага рова — хацеў спусціць па вадзе, але потым стрымаўся: дай, думаю, бабулі пакажу.

Прыбег да яе ў гарод. Тая кінула ў градках разараную бульбу, пайшла да студні, памыла рукі, акуратна перабрала ўсе паперы, а потым сказала, які ж я малайчына, што, падабраўшы гэты бумажнік, нічога з яго не выкінуў — ні пашпарта, ні ашчаднай кніжкі, ні правоў, ні пропуска на завод...

— Гэта вельмі важныя дакументы... Бедны Пятро... Можа, ён галаву скруціў, іх шукаючы, — паспачувала чалавеку бабуля. — Дык ты ўжо, унучак, збегай да яго — аддай.

Акрылены, я, вядома ж, запомніў, дзе жыве той гаротнік, і сарваўся з месца.

Хату знайшоў без праблем (бабуля яе дакладна апісала), а вось брамку адчыніць не здолеў: высокая зашчапка — дзеці, мусіць, там не хадзілі? Таму я праз дзірку ў плоце зазірнуў у двор, адкуль (і сабакам, можна сказаць) адразу ж забрахала нейкая звяглівая цётка: маўляў, чаго гэта я прыпёрся, якой халеры ля іх туляюся? Можа, што выглядаю — шукаю, каб... скрасці?

Чуць вось такое было вельмі крыўдна, але ж я не разгубіўся. Па-даросламу (без бацькаў хлопцы рана сталеюць) адказаў ёй, што шукаць трэба якраз ім, а калі не знойдуць, то хай прыходзяць да нас, да бабулі Васіліны — вуліца Касцельная, дом пяць.

...Каля гэтага дома на лаўцы я затым прасядзеў аж да вечара: чакаў, што нехта прыйдзе, але ўсё было марна. І тады я адважыўся на яшчэ адну спробу: падышоў да знаёмага плота, босай пяткай пагрукаў у брамку і той самай звяглівай цётцы, што карміла ў двары курант, сказаў, каб паклікала мне Пятра Пятровіча (на яго імя былі ўсе дакументы)...

— Яшчэ што загадай мне! Навошта? — з ранейшай злосцю пракрычала цётка і, відаць, прагнала б мяне, але з хаты выйшаў гаспадар, расчыніў перада мной брамку... Я працягнуў бумажнік.

— Гэта ваш?

Мужчына імгненна змяніўся з твару. Спытаў:

— Дзе ты ўзяў?

— Ля рова, на сенажаці знайшоў: ля куста валяўся.

— Але ж мяне там не было! — разгубіўся дзядзька.

— Гэта, мусіць, я, — прызналася яго звяглівая. — Раніцай дождж накрапваў, дык я тваю куртку на плечы ўскінула. Казу ў ёй пасвіла. І што — нейкія грошы згубіла?

— Ну калі ж ты мазгаўню сваю дурную згубіш?! — з болем спытаў у яе мужчына. А мяне, узяўшы за руку, павёў у хату.

Я, вядома ж, спадзяваўся, што зараз ён нечым смачным пачастуе. А яшчэ лепш — пакатае на сваёй машыне. Аднак дзядзька падвёў мяне да секцыі ў зале, сказаў, што цукерак, на жаль, няма, і даў дзве... бутэлькі гарэлкі, каб занёс бабулі.

Яна — як цяпер разумею — была вельмі мудрай жанчынай, таму, убачыўшы нечаканы прэзент, аж запляскала ў ладкі. Сказала, што я ў сям'і — сапраўдны здабытчык, што, дзякуючы мне, яны з мамай і бульбу змогуць дакапаць, і дровы пасекчы — зажыць зімой, як сапраўдныя пані!

Трэба сказаць, што прыкладна так яно і атрымалася... Можа, нават лепш, бо з тога дня Пятро Пятровіч заўсёды падвозіў нас на сваёй машыне. А я зразумеў, як важна, як трэба, як урэшце выгадна рабіць добра.

**А. Драздовіч,**

*г. Гродна.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

***<u>АД ЯЕ Ж</u> чарговае і шчырае: «Пішыце!», бо ўсе «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі з жыцця чытачоў» на старонках «Звязды» не проста друкуюцца — яны ўдзельнічаюць у конкурсе на найлепшую. Вынікі яго будуць падведзены ў пачатку наступнага года. Журы — і вялікае чытацкае пад старшынствам спадарыні Соф'і КУСЯНКОВАЙ з Рагачоўшчыны, і маленькае рэдакцыйнае на чале з першым намеснікам галоўнага рэдактара спадарыняй Наталляй КАРПЕНКАЙ — працуе. Пераможцаў чакаюць прызы.***

Неасабісты суб'ектыў



# Заложнікі нашай любові

## Яны — не пухнатыя цацкі, а жывыя істоты, якія маюць пачуцці

Раніцай кожнага будняга дня я прачынаюся не пад званок будзільніка, а пад вусцішнае выццё. Дзесьці наверсе (вылічыць, дзе менавіта, складана, у нашым дзевятнаццаціпавярховым «слупку» акустыка надзвычай добрая) жыве няшчасны сабака, які вельмі гаруе, калі гаспадары ідуць на работу. Застаючыся адзін, ён роўна ў сем гадзін пачынае сваё гора выказваць адзіным магчымым на яго сабачай мове спосабам. Людзі, якія жывуць у суседніх кватэрах і ідуць на работу пазней, вымушаны збірацца пад такі вось невясёлы акампанемент. Падазраю, многія з іх ужо праклялі тую жывёліну на чым свет стаіць. Хоць яе, калі разабрацца, можна толькі шкадаваць. А вось гаспадароў варта было б спытаць, ці ведаюць яны, як пакутуе іх гадаванец, калі нікога няма дома. Толькі вось як вылічыць тую «нехарошую» кватэру? Так і жывём — гаспадары са спакойным сумленнем на рабоце, суседзі сустракаюць раніцу з агучкай фільма жахаў, а недзе ў пустой кватэры плача жывая істота. Праўда, пра апошняе мала хто задумваецца.

Насамрэч праблему з тым няшчасным сабачкам гаспадарам было б вырашыць вельмі проста. Параіцца са спецыялістам-кінолагам: можа, гадаванцу трэба пакідаць якую цацку, можа, трэба раніцай гуляць з ім трошкі даўжэй — ёсць людзі, якія добра ведаюць псіхалогію жывёл, якія з гэтым працуюць. Канешне, робяць гэта не бясплатна. Але, на жаль, да разумення таго, што, завёўшы жывёлу, яе трэба не толькі карміць і даглядаць, але і клапаціцца пра яе псіхалагічны камфорт, мы яшчэ ў большасці сваёй не дараслі. Тое, што некаторыя сталі прыбіраць за сваімі сабакамі на вуліцы, — гэта ўжо вялізны прагрэс. А думаць пра тое, што гадаванец адчувае, калі яго на цэлы дзень запіраеш аднаго ў кватэры, — гэта ўжо занадта. Корм у місцы ёсць — што яшчэ трэба?

Мы разважаем так, як разважалі нашы продкі-сяляне (мы ж вясковая нацыя, праўда?), і ў тых разважаннях (у дачыненні да вёскі) ёсць свая логіка. Бо там каты-сабакі практычна на вольным выгуле, і галоўны клопат гаспадара — кінуць што ў міску ды абагрэць у дождж ці холад. Перацягнуўшы гадаванцаў у гарадскія кватэры, кардынальна змяніўшы іх жыццё — адабраўшы той самы вольны выгул, мы ніякім чынам не паклапаціліся змяніць уласныя адносіны да іх. Дакладней, да іх пачуццяў.

Пра свае пачуцці мы ведаем усё — мы ж іх любім, гэта нашы мусі-пусі, іх можна пажмякаць, патрымаць на каленях (нават калі яны адчайна вырываюцца). Яны такія мілыя, мяккія, бы плюшавыя цацкі, але ж яшчэ і рухаюцца, і гукі выдаюць. Суцэльная мілата і пацеха! Але — давайце шчыра — атрымліваецца, што любім мы не гадаванцаў, а гэту самую любоў і сябе саміх, такіх добрых, такіх чалавечных. А яны — заложнікі нашай любові... З імі камфортна, утульна. Праўда, клопатаў хапае. Сабак, напрыклад, выгульваць трэба, каб чаго ў кватэры не нарабілі. Бывае, часу няма, а яму, выбачайце, прыперла! Нічога, пацерпіць, не дзіця ж малое. І жывёла церпіць з усіх сіл, бо ведае, што, калі зробіць нешта ў кватэры, яе пакараюць... «Шаноўныя суседзі! Пашкадуйце сваіх сабак, не даводзьце іх да стану, калі яны выбягаюць з хаты з вылупленымі вачыма і лічаць кабіну ліфта за пляцоўку для выгулу», — прачытала сёння раніцай у сваім пад'ездзе. Як бачыце, жыць у нашым «слупку» нясумна...

— Дарагая, ты пра мяне думаеш?
— Не, я думаю за цябе.



caricatura.ru


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае міністэрствам інфармацыі рэспублікі беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3885.
Нумар падпісаны ў 19.30 21 лістапада 2019 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

22 лістапада 2019 г. № 46 (531)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ТЭМА ТЫДНЯ



Фота БелТА.

# ЖЫЛЛЁВАЕ ПЫТАННЕ: АДКАЗ БУДЗЕ

## Пастаноўка на ўлік па-новаму, управа на дэбашыра ў інтэрнаце і іншыя навацыі

**ЗМЯНЕННІ ў Жыллёвы кодэкс і шэраг іншых нарматыўных прававых актаў у сферы жыллёвага заканадаўства набудуць сілу літаральна праз паўтара месяца. Мы паспрабавалі адшукаць самыя вострыя вуглы новаўвядзенняў і ўявіць, як будзе працаваць гэты дакумент пачынаючы з 2020 года.**

«Праект Жыллёвага кодэкса замацоўвае тое новае і перспектыўнае, што напрацавана ў жыллёвай палітыцы дзяржавы за апошнія гады. Падрыхтаваны комплексны дакумент, які рэгулюе ўсе найбольш важныя кірункі жыллёвай сферы», — растлумачыў **першы намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Генадзь ТРУБІЛА.**

### УСЁ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД ПЛОШЧЫ

Па інфармацыі Нацыянальнага прававога інтэрнэт-партала Беларусі, у будучым Жыллёвым кодэксе замацавана новая структура платы за жыллёва-камунальныя паслугі.

Ужо цяпер вызначана структура паведамлення аб аплаце жыллёва-камунальных паслуг і плаце за карыстанне жылымі памяшканнямі з расшыфроўкай фактычных выдаткаў па жылым доме. У пералік асноўных увайшлі паслугі па тэхнічным абслугоўванні ліфта, санітарным утрыманні дапаможных памяшканняў жылога дома, пакрыццё выдаткаў на электраэнергію, спажытую на асвятленне дапаможных памяшканняў шматкватэрнага жылога дома і работу абсталявання, удакладнены парадак іх аплаты.

З першых дзён студзеня такія паслугі нашы жыхары стануць аплачваць зыходзячы з агульнай плошчы кватэры. Гэта значыць, што ўладальнік трохпакаёвай кватэры будзе плаціць апрыёры больш, чым уладальнік аднапакаёвай. Раней плата размяркоўвалася ў залежнасці ад колькасці зарэгістраваных жыхароў, што не ўлічвала памер долі ў праве ўласнасці домаўладання.

стар. 3



ТОЛЬКІ ЛІЧБЫ

## Кватэры чаргавікам

**У Беларусі 38,2 % уведзенага ў студзені — кастрычніку жылля пабудавана для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.**

Аб гэтым паведамілі БелТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Арганізацыі ўсіх формаў уласнасці пабудавалі 32,2 тысячы новых кватэр, увялі ў эксплуатацыю 2 мільёны 882,4 тысячы «квадратаў» агульнай плошчы жылля. Для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, уведзены ў эксплуатацыю 1 мільён 100,8 тысячы квадратных метраў. З агульнага аб'ёму уведзенага жылля для чаргавікоў з выкарыстаннем дзяржпадтрымкі пабудавана 774,1 тысячы «квадратаў».

У сельскіх населеных пунктах пабудавана 971 тысяча квадратных метраў жылля, або 33,7 % агульнай колькасці па краіне.

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### Навацыі для парадку



Парламентарыі прынялі змены ў законапраект «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» ў другім чытанні. стар. 2

### Будаўніцтва па-новаму



У Беларусі зацвердзілі першыя сем будаўнічых нормаў. Чаго яны датычацца? стар. 3

### Жыць у сваім доме



Шматдзетная маці хоча закончыць рэканструкцыю ўласнага дома, але сродкаў не хапае, што рабіць? стар. 4

### Усё ад электрычнасці



Эксперыментальны электрадом з'явіцца ў Магілёве ўжо ў 2020 годзе. стар. 4

### Метры разладу



Пагадненне аб карыстанні жыллём можа выратаваць ад доўгіх судовых цяжбаў, зберагчы спакой і здароўе. стар. 14

ЗАКАНАТВОРЧАСЦЬ

# НАВАЦЫІ ДЛЯ ПАРАДКУ

## Змены ў законапраект «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» прынялі ў другім чытанні

**Адрэдагаваны закон разглядалі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў на пасяджэнні сёмай сесіі шостага склікання. Рэвізія нормаў па кантрольных паўнамоцтвах мясцовых Саветаў дэпутатаў, выканаўчых і распарадчых органаў адбылася для прывядзення прадпісанняў у адпаведнасць з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 376. З улікам Указа «Аб службе «Адно акно» ўносяцца змены ў артыкул 42 закона «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» — за аблвыканкамамі і Мінгарвыканкамам замацоўваюцца функцыі па каардынацыі дзейнасці гэтых службаў.**

«У сувязі з тым, што мясцовыя Саветы дэпутатаў абласнога і базавага ўзроўню прымаюць рашэнне аб зацвярджэнні інвестыцыйных праграм, закон дапаўняецца нормамі, згодна з якімі выканкамы распрацоўваюць і ўносяць на зацвярджэнне ў Саветы дэпутатаў праекты такіх праграм, а тыя, у сваю чаргу, іх зацвярджаюць», — прадставіў змены **старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Леанід ЦУПРЫК.**

Адрэдагавалі таксама артыкулы 43—45 закона, якія рэгламентавалі пытанні паўнамоцтваў выканкамаў і адміністрацый раёнаў па забеспячэнні добраўпарадкавання і належным санітарным стане населеных пунктаў.

Магчымасцю пракаментаваць змены ў вышэйназваныя артыкулы скарысталася **дэпутат Вольга ПАЛІЦІКА.** Яна адзначыла, што нормы выклікалі дыскусіі, але дапрацаваныя навацыі гучаць больш прымальна. «Гэта той выпадак, калі асаблівая шкада, што мы не пакетным спосабам разглядаем у цэлым заканадаўчыя акты», — падкрэсліла дэпутат.

Змены ў артыкулы 43-45 надзяляюць мясцовыя органы ўлады паўнамоцтвамі па прыцягненні юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў да выканання работ па падтрыманні санітарнага стану на тэрыторыях земляў агульнага карыстання населеных пунктаў (у тым ліку на прылеглых да іх зямельных участках) сваімі сіламі або за кошт уласных сродкаў.

«Парадак вызначэння тэрыторый, якія замацоўваюцца за юрасобамі і ІП, перыядычнасць выконваемых работ, як сказана ў нормах артыкула, будзе вызначаць Савет Міністраў, але тым больш сёння мы не бачым гэтага парадку і не ведаем, што там будзе», — звярнула ўвагу Вольга Паліціка.

Па дзеючым жыллёвым заканадаўстве, па словах парламентарыя, арганізацыі ўласнікаў могуць за свае сродкі прыбіраць толькі прыдамавую тэрыторыю, якую перадалі ім у арэнду ці для абслугоўвання жылога дома. Усю астатнюю — толькі за кошт мясцовых бюджэтаў.

«Як адказаў распрацоўшчык, менавіта Мінжылкамгас, у вышэйназваным парадку, які распрацуе Саўмін, будзе вызначана, што за арганізацыямі ўласнікаў не будуць замацоўвацца тэрыторыі агульнага карыстання. На практыцы шмат гэта выклікае пытанняў», — падкрэсліла Вольга Паліціка.

У першым чытанні закон быў прыняты больш за год таму — 12 лістапада 2018 года. Пры падрыхтоўцы законапраекта да другога чытання паступіў шэраг заўваг ад дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, прадстаўнікоў Камітэта дзяржаўнага кантролю, прапановы мясцовых Саветаў дэпутатаў, аблвыканкамаў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# Агульны вектар

**Парламенцкая дэлегацыя Беларусі, якую ўзначальвае старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч, бярэ ўдзел у мерапрыемствах Міжпарламенцкай Асамблеі краін-удзельніц СНД, што праходзяць 21—22 лістапада ў Санкт-Пецярбургу.**

Учора, 21 лістапада, адбылося пасяджэнне Савета МПА СНД, дзе разгледжаны вынікі апошніх пасяджэнняў саветаў кіраўнікоў дзяржаў і урадаў краін СНД.

Як паведамляе прэс-служба верхняй палаты беларускага парламента, удзельнікі пасяджэння таксама абмеркавалі, як ідзе работа над праектамі Стратэгіі эканамічнага развіцця СНД на перыяд да 2030 года, плана мерапрыемстваў МПА СНД да 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, а таксама над праектам перспектыўнага плана мадэльнай заканатворчасці ў СНД на 2020—2022 гады. Акрамя таго, у полі зроку ўдзельнікаў знаходзіліся пытанне аб арганізацыі назірання за выбарамі ў краінах СНД і іншыя.

Сёння, 22 лістапада, пройдзе пяцідзясятае пленарнае пасяджэнне МПА СНД, дзе будуць разгледжаны мадэльныя законы аб абавязацельным праве, рэкламе, сацыяльным і экалагічным турызме, праекты рэкамендацый па ўжыванні прынцыпаў міжнароднага гуманітарнага права пры супрацьдзеянні тэрарызму і гвалтоўным праявам экстрэмізму, а таксама па арганізацыі нацыянальных цэнтраў экалагічнай бяспекі.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# КАЛІ РАБОТА І РАСЦЭНКІ ЖКГ НЕ ЗАДАВАЛЬНЯЮЦЬ...

## Жыллёвыя і іншыя пытанні, што турбуюць жыхароў у рэгіёнах, задалі падчас прамых ліній

**Пераважна жыллёвыя пытанні турбуюць жыхароў Гомельшчыны. Менавіта з імі звярталіся на прамую тэлефонную лінію, якую разам з прыёмам грамадзян у Веткаўскім раёне правёў старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ.**



Першае тэлефанаванне паступіла з Гомеля. Заяўніца расказала, што летась работнікі ЖКГ пафарбавалі фасад аднаго з дамоў па вуліцы Кірава. Паводле слоў жанчыны, фарбавалі спачатку цокаль, затым фасад, і запэцкалі ніжнюю частку. Былі і іншыя парушэнні. Пасля завяршэння работ дольшчыкам выставілі рахунак, ён аказаўся даволі вялікім і не адпавядаў, на думку гамяльчанкі, аб'ёмам выкананых работ. «Другі год шукаем праўду ў ЖКГ, а яны сцвярджаюць, што расцэнкі цалкам апраўданыя», — скардзілася жанчына. Для вырашэння пытання старшыня аблвыканкама даручыў стварыць камісію. «Паглядзім усе акты, прааналізуем аб'ёмы работ, каб разабрацца», — падкрэсліў ён.

З аграгарадка Дуброва Светлагорскага раёна патэлефанавала інвалід 2-й групы. Жанчына расказала, што жыве ў доме, які належыць сельгаспрадпрыемству, у якім раней яна працавала даяркай. Паводле слоў заяўніцы, вокны у доме ў дрэнным стане — амаль не зачыняюцца. «Трэба дапамагчы чалавеку, навесці парадак. У цяжкую хвіліну ён не павінен заставацца сам-насам з праблемай, якая яго хвалюе», — агучыў пазіцыю Генадзь Салавей.

Жыхарка вёскі Хальч Веткаўскага раёна паскардзілася, што на вуліцы не гарэць ліхтары. «Ідзеш з работы — вельмі цёмна, спатыкаешся», — растлумачыла яна. Кіраўніцтву Веткаўскага раёна пастаўлена задача разабрацца.

Дачніца з вёскі Прысно Веткаўскага раёна прасіла разгледзець магчымасць устанавіць дадатковы прыпынак грамадскага транспарту ў гэтым населеным пункце. Паводле яе слоў, адлегласць паміж тымі, што маюцца, вельмі вялікая. Пытанне вывучаць спецыялісты «Гомельаблаўтатранса» і дарожных службаў.

Датэлефанавалася на прамую лінію і мама дзевяцікласніцы школы № 1 Веткі. Жанчына падзякавала адукацыйнай установе, настаўніку фізкультуры і трэнеру па скалалажанні Яўгену Беляцкаму за якасную падрыхтоўку дзяцей, іх падтрымку і матывацыю.

А вось у жыхароў Іванава іншая праблема — у мясцовай паліклініцы не хапае неўролагаў. Яе ўдалося вырашыць непасрэдна падчас правядзення **памочнікам Прэзідэнта — інспектарам па Брэсцкай вобласці Анатолем МАРКЕВІЧАМ** прамой тэлефоннай лініі.



Жыхарка райцэнтра расказала, што каб трапіць да неўролага ў мясцовай паліклініцы, трэба чакаць месяц. Тое, што праблема існуе, пацвердзіла прадстаўнік адміністрацыі цэнтральнай раённай бальніцы, бо ў цяперашні час два спецыялісты павышаюць сваю кваліфікацыю. Пацыентаў у асноўным прымаюць урачы агульнай практыкі, а таксама спецыялісты ў паліклініках Пінска і Брэста. Яшчэ адзін неўролаг вельмі патрэбны, пагадзіліся ў ЦРБ.

«Добра, што вашы спецыялісты павышаюць кваліфікацыю. Але людзі ад гэтага не павінны пакутаваць. Дрэнна, што вы не прынялі мер для таго, каб пацыенты, якія маюць патрэбу ў абследаванні ці кансультацыі, маглі гэтую дапамогу атрымаць — не праз два тыдні ці месяц, а аператыўна, — падкрэсліў Анатоль Маркевіч. — Чалавеку трэба сабрацца і выехаць у Брэст ці Пінск. Ці не прасцей спецыялісту прыехаць на месца і правесці прыём?»

У студзені з перападрыхтоўкі вернуцца два ўрачы і сітуацыя з неўралагічнай дапамогай у Іванаве павінна змяніцца. А ў лістападзе—снежні сюды накіруюць спецыялістаў з іншых клінік. Такая дамова была дасягнута падчас тэлефоннай размовы з начальнікам галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Брэсцкага аблвыканкама Віктарам Міхалоўскім.

Падчас прамой тэлефоннай лініі Анатоль Маркевіч адказаў і на іншыя пытанні, якія датычыліся льгот для інвалідаў пры аплаце камунальных паслуг, павышэння працоўных пенсій пэўным катэгорыям грамадзян, выкарыстання чэкаў «Маёмасць», арэнды зямельных участкаў. Пасля памочнік прэзідэнта правёў прыём па асабістых пытаннях.

**Паводле БелТА.**



Фота БелТА.

# ЖЫЛЛЁВАЕ ПЫТАННЕ: АДКАЗ БУДЗЕ



Фота БелТА.

## ХТО СТАІЦЬ, ДЗЕ, ЗА КІМ І ЧАМУ?

Новая рэдакцыя кодэкса прадугледжвае ўдасканаленне парадку ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Заканадаўча ўрэгулявана пашырэнне нормаў па іх уліку на грамадзян Беларусі, замежных грамадзян, асоб без грамадзянства, тых, хто пастаянна жыве на тэрыторыі краіны (не пашыраецца на замежных грамадзян, асоб без грамадзянства, якія часова жывуць на тэрыторыі нашай краіны).

У праекце кодэкса змяніліся падыходы да пастаноўкі на ўлік тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, жыхароў Мінскага раёна. Цяпер сем'і змогуць прэтэндаваць на паляпшэнне жыллёвых умоў, калі не маюць ва ўласнасці і валоданні жылых памяшканняў, размешчаных не толькі ў іх населеным пункце, але і ў сталіцы.

Новым кодэксам устаноўлена права першачарговага атрымання жылых памяшканняў у інтэрнатах былымі выхаванцамі дзіцячых інтэрнатаў, а таксама паўналетнімі дзецьмі людзей, якія жывуць у спецыяльных дамах для ветэранаў, састарэлых і інвалідаў.

Вырашана пытанне з нормай плошчы для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, — удакладнены склад плошчаў памяшканняў, якія ўключаюцца ў агульную жылплошчу. Цяпер гэта сума жылой плошчы і плошчы падсобных памяшканняў, акрамя балконаў і лоджый. У новай версіі кодэкса выключэнне складуць таксама тэрасы і памяшканні, якія не ацяпляюцца. Наяўнасць вялікіх лоджый, тэрас, халодных камор або верандаў не будзе разглядацца як падстава для адмовы ў прыняцці на ўлік.

Для былых вайскоўцаў у поўнай меры ўключылі сацыяльны аспект. Па прапанове Міністэрства абароны ў лік тых, хто можа прэтэндаваць на месца ў інтэрнаце ў прыярытэтным парадку, уключаны людзі, якія маюць станоўчыя рэкамендацыі пасля праходжання тэрміновай ваеннай службы.

Цяпер правам на пазачарговае ўключэнне ў арганізацыі забудоўшчыкаў запланавана надзяліць ветэранаў баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Акрамя таго, за сельскагаспадарчымі арганізацыямі замацавана права паўторна прадастаўляць вызваленыя жылыя памяшканні дзяржаўнага жыллёвага фонду, якія былі пабудаваны з выкарыстаннем сродкаў мясцовых бюджэтаў, мясцовых мэтавых бюджэтных жыллёва-інвестыцыйных фондаў, інавацыйных фондаў, а таксама льготных крэдытаў Белаграпрамбанка і перададзены імі ў камунальную ўласнасць (альбо ў яе межах) у рамках фінансавага аздараўлення арганізацый.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

## ПЕРАВЕСЦІ З АРЭНДНАГА Ў САЦЫЯЛЬНАЕ МОЖНА, АЛЕ ТОЛЬКІ АДНОЙЧЫ

Гэты дакумент цалкам захоўвае сацыяльныя і прававыя гарантыі для грамадзян у жыллёвай сферы. Такім чынам, застаецца магчымасць атрымання жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання шматдзетнымі сем'ямі, інвалідамі I і II групы, адзінокімі непрацаздольнымі пенсіянерамі, сем'ямі з дзецьмі-інвалідамі і іншымі катэгорыямі.

Новы кодэкс замацаваў адпаведны парадак давання арэнднага жылля. Для першачарговага давання на перыяд працоўных адносін — не больш за 30 % ад агульнай колькасці незаселенага арэнднага жылля камунальнага жылфонду. Для вайскоўцаў —10 %. Астатнія 60 працэнтаў размяркоўваюцца ў агульным парадку грамадзянам, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў па заяўным прынцыпе, зыходзячы з даты пастаноўкі на ўлік. Пры адсутнасці такіх грамадзян арэнднае жыллё мае права атрымаць кожны ахвотны.

Замацаваны механізм вызначэння памеру платы за карыстанне такім жыллём. Паніжальныя каэфіцыенты выкарыстоўваюцца ў дачыненні да жылых памяшканняў, уключаных у склад арэнднага жылля з ліку службовых, спецыяльных службовых і асобных відаў спецыяльных жылых памяшканняў. А таксама займаных грамадзянамі па дагаворах найму і тых, якія даюцца ў першачарговым парадку на перыяд працоўных адносін.

Удасканалены механізм унясення платы за карыстанне арэндным жыллём з выкарыстаннем паніжальных каэфіцыентаў асобамі з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў.

Акрамя таго, сацыяльна неабароненыя катэгорыі асоб, якія пражываюць у арэндным жыллі і маюць права на сацыяльныя метры, могуць перавесці сваё жыллё ў сацыяльнае, за пражыванне ў якім плата не спаганяецца. Зрабіць гэта можна будзе толькі адзін раз. Дарэчы, пры даванні жылога памяшкання сацыяльнага карыстання ўстаноўлена, што яно не можа быць меншым за аднапакаёвую кватэру.

Выканкамы абавязаны даваць жылыя «квадраты» з безбар'ерным асяроддзем людзям, якія атрымалі інваліднасць у перыяд валодання дзяржаўным жыллёвым фондам. Прадугледжана выключная адказнасць уласнікаў жылля за іх утрыманне, у тым ліку ў дачыненні да такіх метраў з катэгорыі дзяржаўнага жылфонду. Утрыманне ўсяго фонду ляжа не на наймальніка жылога памяшкання — часовага «карыстальніка», а на яго ўласніка.

## НЕ БУЯНЬ У ІНТЭРНАЦЕ

Абноўлены кодэкс прапісвае механізм уздзеяння на тых, хто перашкаджае пражыванню іншых жыхароў у інтэрнаце або псуе агульную маёмасць. Цяпер такіх хуліганаў можна будзе выселіць з інтэрнатаў па патрабаванні наймадаўца ў выпадку сістэматычнага разбурэння і псавання жылых ці іншых памяшканняў. Высяляць будуць і пры парушэннях правілаў карыстання такімі памяшканнямі, якія робяць немагчымым для іншых пражыванне ў адным інтэрнаце, — калі чалавек тры разы прыцягваецца да адміністрацыйнай адказнасці за такія ўчынкі.

Устаноўлена права першачарговага атрымання жылля ў інтэрнатах былымі выхаванцамі дзіцячых інтэрнатных устаноў (за выключэннем інтэрнатаў, што знаходзяцца ў падпарадкаванні спецыялізаваных вучэбна-спартыўных устаноў, якія даюцца на перыяд спартыўнай падрыхтоўкі), а таксама паўналетнімі дзецьмі грамадзян, якія жывуць у спецыяльных дамах для ветэранаў, састарэлых і інвалідаў.

## ДЗЕЙНАСЦЬ ТАВАРЫСТВАЎ УЛАСНІКАЎ

Зменіцца парадак прыняцця рашэнняў у таварыствах уласнікаў і іншых сумесных домаўладаннях. Захоўваюцца два спосабы кіравання — з дапамогай самаарганізацыі і стварэння таварыства ўласнікаў або ЖБВК і праз упаўнаважаную асобу.

Магчымасць аб'ядноўвацца ў таварыства ўласнікаў з'явіцца ў жыхароў групы блакіраваных жылых дамоў, размешчаных на агульнай тэрыторыі. Зменены механізм прыняцця рашэнняў: зніжаны парог яўкі на агульны сход — рашэнні будуць прымацца большасцю галасоў прысутных на агульным сходзе, на які прыйшло не менш за палову жыхароў дома. Пасля ўваходжання ў сілу новай рэдакцыі Жыллёвага кодэкса для рашэння аб ліквідацыі таварыства ўласнікаў або арганізацыі забудоўшчыкаў спатрэбіцца згода толькі дзвюх трацін жыхароў. Кворум па прыняцці рашэнняў аб адчужэнні часткі агульнай маёмасці пры рэканструкцыі таксама зніжаны да дзвюх трацін удзельнікаў.

## НЕДАТЫКАЛЬНЫЯ «СПЕЦРАХУНКІ»

У новым законе ўрэгуляваны асаблівасці функцыянавання рахункаў, на якіх акумулюецца плата за капітальны рамонт. У іх з'явіцца статус «спецрахунку», які не дазволіць спісваць з іх назапашаныя плацельшчыкамі жыллёва-камунальных паслуг сродкі ў бясспрэчным парадку па выканаўчых і іншых дакументах.

Аперацыі па спецыяльных рахунках прыпыняцца не будуць, арышт на іх не будзе накладацца, акрамя выпадкаў, звязаных з прадухіленнем легалізацыі даходаў, атрыманых злачынным шляхам. Вызваляцца ад платы за капітальны рамонт будуць уласнікі часткі блакіраваных жылых дамоў. Яны ўносяць такую плату разам з наймальнікамі памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ДА ВЕДАМА

# Будаўніцтва па новых правілах

**Першыя сем будаўнічых нормаў зацверджаны ў Беларусі пастановай Міністэрства будаўніцтва і архітэктуры ад 31 кастрычніка 2019 года № 59, паведамляе БелТА са спасылкай на прэс-службу ведамства.**

Нормы датычацца бяспечнай эксплуатацыі будынкаў, у тым ліку інжынерных камунікацый, распрацоўкі праектаў па ключавых інжынерных збудаваннях — мастах і трубах. Чакаецца, што яны будуць уведзены ў дзеянне з 1 лютага 2020 года.

«Цяпер дакументы накіраваны на прававую экспертызу ў Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі, пасля чаго будуць размешчаны ў адкрытым доступе ў рэжыме анлайн на афіцыйных сайтах і ў складзе спецыялізаваных баз даных. Да канца бягучага года плануецца зацвердзіць яшчэ 26 дакументаў, з іх 13 ужо ўзгоднены», — праінфармавалі ў прэс-службе.

У ведамстве адзначылі, што ўвядзенне падобных нарматыўных прававых актаў змяняе падыходы да нармавання. Новая сістэма з'яўляецца больш прагрэсіўнай і гнуткай, значна спрашчае праектаванне. Будаўнічыя нормы выключаюць канкрэтныя аб'ёмна-планіровачныя канструкцыйныя рашэнні, абавязковыя прадпісанні, якія дзейнічалі раней. Дакументамі замацаваны толькі абавязковыя параметры бяспекі. Такі прынцып дае магчымасць зняць тэхнічныя бар'еры для інавацыйных матэрыялаў і тэхналогій, праектных рашэнняў.



Як паведамлялася, новыя віды тэхнічных нарматыўных прававых актаў — будаўнічыя нормы і правілы — уведзены ўказам ад 5 чэрвеня 2019 года № 217. Будаўнічыя нормы Беларусі (БНБ) — гэта патрабаванні ў галіне бяспекі будынкаў і збудаванняў, прызначаныя для абавязковага выкарыстання. А будаўнічыя правілы Беларусі (БПБ) — спосабы дасягнення будаўнічых нормаў. Выкарыстоўвацца БПБ будуць на добраахвотнай аснове.

Тэхнічныя нарматыўныя прававыя акты іншых дзяржаўных органаў у частцы, што замацоўвалі абавязковыя патрабаванні пры праектаванні і будаўніцтве аб'ектаў, падлягаюць прызнанню страціўшымі сілу пасля ўвядзення ў дзеянне БНБ і БПБ. Для праектнай дакументацыі, якая знаходзіцца ў стадыі распрацоўкі, і аб'ектаў, будаўніцтва якіх пачалося да ўвядзення ў дзеянне БНБ і БПБ, прадугледжаны пераходны перыяд.

СІТУАЦЫЯ

# ЖЫЦЬ У СВАІМ ДОМЕ

## Але ж каб рэалізаваць гэтую мару, трэба разлічваць не толькі на дапамогу дзяржавы, але і ўлічваць уласныя магчымасці

**У адным з кастрычніцкіх нумароў мы паведамлялі, як на прыём да намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Мікалая Снапкова прыехала шматдзетная сям'я. Прасілі дапамагчы паспрыяць у заканчэнні будаўніцтва дома. Уласны карэспандэнт па Віцебскай вобласці пасля публікацыі адправіўся ў аграгарадок Крапіўна Аршанскага раёна, дзе жывуць заяўнікі, каб на месцы высветліць падрабязнасці.**



Марыя ХОДАС у недабудаваным доме.

### Вось гэты дом...

Ад Оршы да населенага пункта Крапіўна ехаць на аўто хвілін пятнаццаць. Марыя Ходас, якая і звярнулася з просьбай да намесніка кіраўніка Адміністрацыі, нагадала, як кажуць, сутнасць праблемы. Гутарылі, дарэчы, у доме, які будаваўся для сям'і, ды стаў даўгабудам. У вяскоўцаў выхоўваюцца шасцёра дзяцей: чацвёра сваіх і двое — на апецы. Усе непаўналетнія.

Шматдзетная мама родам з Аршанскага раёна. Жыла ў розных вёсках. Муж працуе грузчыкам на дзяржаўным прадпрыемстве. Марыя марыла, каб сям'і было ўтульна ў вялікім доме, сцены і дах якога ўзведзеныя на месцы невялікага драўлянага. Яго рэшткі можна і цяпер убачыць.

Канешне, рэканструкцыя пачалася з выкарыстання льготнай дзяржаўнай падтрымкі, бо шматдзетным сем'ям — асаблівы клопат і дапамога. Чаму не дабудавана жыллё — гісторыя заблытаная. Зразумець дакладна прычыну, калі не ўнікаць гадзінамі ва ўсе нюансы цяжка.

На асабістым прыёме Мікалая Снапкова жанчына, ледзь не плачучы, растлумачыла, што жыве сям'я зараз у здымным жыллі: двухпакаёвай кватэры шматкватэрнага дома ў тым жа аграгарадку. Гаспадар жылля, як сцвярджала шматдзетная мама, папрасіў вызваліць «метры», бо хоча там пасяліць сваяка... Што і было зроблена 1 лістапада. А жыць у недабудаваным уласным доме немагчыма: няма яшчэ сістэмы ацяплення, водазабеспячэння, падачы газу...

### Не хапіла грошай...

У чэрвені яна сустрэлася з кіраўніком камітэта па архітэктуры і будаўніцтве аблвыканкама. Па выніках гэтага было прапанавана звярнуцца ў райвыканкам па пытанні выдзялення жылля камерцыйнага выкарыстання. Але сям'я адмовілася.

У афіцыйным адказе таксама адзначалася, што няма магчымасці павялічыць крэдыт на рэканструкцыю жылога дома.

У адным з адказаў з аблвыканкама (ад 23 верасня) гаворыцца, што як шматдзетнай сям'і ім выдзелена субсідыя на выплату часткі працэнтаў за карыстанне крэдытам і субсідыя на пагашэнне асноўнага доўгу па гэтым крэдыце на рэканструкцыю жылога дома. Зроблена гэта ў адпаведнасці з прэзідэнцкім указам, які прадугледжвае падтрымку пры будаўніцтве і рэканструкцыі жылых памяшканняў.

Прывяду цытату: «Максімальная велічыня крэдыту на рэканструкцыю жылога дома і для выдзялення субсідый была ўстаноўлена ў памеры 71,8 тысячы рублёў...»

Далей гаворыцца, што калі ў чэрвені мінулага года прымалі неабходныя дакументы, растлумачылі, што неабходных уласныя грошы 52,22 тысячы рублёў — на пакрыццё розніцы паміж коштам работ на рэканструкцыю і банкаўскім крэдытам. І ў канцы адзначана, што ў сувязі з нараджэннем чацвёртага дзіцяці памер субсідыі павялічаны да 86,16 тысячы рублёў.

Марыя сказала, што проста напэўна не зразумела ўсіх нюансаў і таму атрымалася тое, што ёсць... Як сцвярджае жанчына, калі толькі яна пісала лісты вышэйшым службовым асобам у Мінск, у прыватнасці, на імя кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, рэакцыя мясцовых службаў была, можна так сказаць, «на апярэджанне».

«Раптам праяўлялі інтарэс да нас. Прасілі, каб не скардзілася, бо можна дапамагчы на мясцовым узроўні, — кажа Марыя. — У прыватнасці, у райвыканкаме папрасілі газавікоў, прадстаўнікоў службы водазабеспячэння, дапамагчы, хто чым можа. Напрыклад, з'явілася магчымасць купіць газавую пліту і кацёл у растэрміноўку. Але ж на батарэі ў нас грошай няма, як і на ўнутраныя работы па ўстройстве ацяплення і іншае...»

### Часова пасяліліся ў сястры

Калі мы гутарылі, гаспадыня паказала мне шмат афіцыйных адказаў. Адзін з іх — зноў жа — з райвыканкама, у якім адзначана, што банк не мае падстаў для дадатковага льготнага крэдытавання. Ніжэй паведамляецца, што аддзелам архітэктуры і будаўніцтва райвыканкама ўстаноўлены шэраг адступленняў ад праектнай дакументацыі... Але Марыя не разумее, чаму так канстатуецца.

«Наогул, калі вялося будаўніцтва, ніхто з чыноўнікаў якасць працэсу не кантраляваў. Нікога не хвалявала, як будуецца жыллё для шматдзетнай сям'і», — разважае жанчына.

Калі сапраўды ў дакументах адлюстравана рэчаіснасць, міжволі напрошваецца вывад: дык чаго тая жанчына хоча? Адказы банальныя: разумець, што будзе далей, дзе будуць жыць і што рабіць з домам.

Зараз сям'я жыве ў гэтым жа населеным пункце часова ў сястры Марыі, але тая таксама шматдзетная, мама пяцярых дзяцей... Жыве ў адносна невялікім доме. І гэтае жыллё, дарэчы, знаходзіцца насупраць таго, дзе павінны былі б справіць наваселле Марыя з мужам і дзецьмі.

### Які механізм вырашэння праблемы?

У камітэце па архітэктуры і будаўніцтве Віцебскага аблвыканкама растлумачылі ўсе нюансы праблемнай сітуацыі і паралі, што рабіць. Калі коратка, як той казаў, папросту, сям'я на тое, каб адбудаваць новы дом, выдаткавала грошай больш, чым прадугледжана адпаведным заканадаўствам. І на сення законных падстаў для павелічэння крэдыту няма.

Пры гэтым, улічваючы, што насамрэч у жыллё, якое не здадзена пад ключ, немагчыма засяліцца і няма грошай на завяршэнне ўсіх неабходных работ, Ходасам прапанавалі жыллё камерцыйнага выкарыстання...

Акрамя таго, згодна з дзеючым указам аб сямейным капітале, з 1 студзеня наступнага года ёсць магчымасць датэрмінова выкарыстоўваць гэтыя грошы для паляпшэння жыллёвых умоў. Гэта значыць, што заяўніца мае права звярнуцца ў райвыканкам па дазвол на выкарыстанне сямейнага капіталу дзеля таго, каб урэшце завяршыць рэканструкцыю дома.

Гісторыя Ходасаў, бадай, нетыповая. Мы будзем сачыць за працягам гэтай заблытанай сітуацыі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.**

### Неабходны каментарый

**Начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Аршанскага райвыканкама Таццяна ГАЛЕЕВА:**

— Райвыканкаму было даручана разглядзець пытанне забеспячэння жыллём сям'і Ходас да вырашэння праблем, звязаных з рэканструкцыяй іх дома. Марыі Дзмітрыеўне на сённяшні дзень прапанаваны тры варыянты — дзве трохпакаёвыя кватэры і адна двухпакаёвая агульнай плошчай ад 50 да 70 квадратных метраў у розных частках Оршы. З ёй абгавораны ўмовы арэнды жылля і аплаты камунальных паслуг. Жанчына да канца гэтага тыдня абяцала вызначыцца з рашэннем і паведаміць, які варыянт яе задавальняе. Пакуль яна пражывае ў сваёй сястры ў аграгарадку Крапіўна. Асцятнія пытанні знаходзяцца на кантролі Адміністрацыі Прэзідэнта і Віцебскага аблвыканкама.

ПРАЕКТЫ І РАШЭННІ

# УСЁ АД ЭЛЕКТРЫЧНАСЦІ

## Эксперыментальны электрадом з'явіцца ў Магілёве

**У абласным цэнтры распачалі будаўніцтва жылога дома, дзе для ацяплення, гарачага водазабеспячэння і прыгатавання ежы будзе выкарыстоўвацца электраэнергія.**

Пра пілотны праект расказаў **намеснік начальніка Магілёўскага абласнога ўпраўлення па наглядзе за рацыянальным выкарыстаннем паліўна-энергетычных рэсурсаў Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Аляксандр МАСЛАЎ,** паведамляе БелТА.

Праект распрацаваны ААТ «Магілёўграмадзянпраект» і прайшоў экспертызу ў жніўні гэтага года. Тэрмін уводу дома ў эксплуатацыю — май 2020 года.

Трохпавярховы будынак з'явіцца на вуліцы Вароўскага і разлічаны на 24 кватэры. У прыбудове да яго размесціцца інжынерныя памяшканні (сувязі, набору вады, інвентарная і электрашчытавая) з асобным уваходам. Фасад будзе вентыляваны, сцены ўцепляць мінералаватнымі плітамі.

У кватэрах прадугледжаны электраабагравальнікі айчыннай вытворчасці з рэгуляваннем цеплавой магутнасці. Цэнтралізаванае гарачае водазабеспячэнне тут адсутнічае. Вада будзе падагравацца 100-літровымі электраводанагравальнікамі, усталяванымі ў санвузле кожнай кватэры.

Пасля завяршэння праекта спецыялісты Магілёўскага абласнога ўпраўлення па наглядзе за рацыянальным выкарыстаннем ПЭР прааналізуюць вынікі. Атрыманыя даныя па электраспажыванні ўлічаць пры падрыхтоўцы планаў па будаўніцтве цалкам электрыфікаванага жыллёвага фонду.

Фінансавацца ўзвядзенне эксперыментальнага электрадома будзе за кошт сродкаў гарадскога бюджэту. У перспектыве ў абласным цэнтры з'явіцца яшчэ некалькі такіх дамоў.

### ❍ У тэму

**Падчас прыёму грамадзян кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Натальляй Качанавай у Расонах Віцебскай вобласці сваёй праблемай падзялілася шматдзетная сям'я — Ірына і Дзмітрый Кірыловічы з Асіповіч.**

Яны паведамілі, што разам з чатырма дзецьмі жывуць у малагабарытнай кватэры і жадалі б палепшыць сваё жыллёвае становішча. «Мы хочам купіць дом на другасным рынку і ўжо знайшлі прыдатны, але сутыкнуліся з тым, што кошт дома па ацэнцы Агенцтва па нерухомасці і зямельным кадастры ніжэйшы за тую суму, якую просіць прадавец. І тут узнікае праблема з выдзяленнем субсідыі», — паведамілі сужэнцы.

Наталля Качанава патлумачыла, што будаўніцтва жылля для шматдзетных сем'яў — прыярытэтная задача для дзяржавы і Прэзідэнт трымае гэтае пытанне на кантролі. Існуе даручэнне забяспечыць шматдзетныя сем'і жыллём на працягу двух-трох гадоў. «У вашай сітуацыі ёсць розныя варыянты вырашэння, і вам будуць іх прапаноўваць. Іншая рэч, калі вы будзеце адмаўляцца. Мы возьмем вашу сітуацыю на кантроль, дапаможам», — запэўніла кіраўнік Адміністрацыі.

Як паведаміў **старшыня Асіповіцкага райсавета дэпутатаў Сяргей СУВЕЕЎ,** мясцовыя ўлады прапанавалі заяўнікам наступны варыянт:

— Цяпер сям'я жыве ў трохпакаёвай кватэры, дадаткова ёй раней прапаноўвалі крэдыт на пабудову яшчэ адной, двухпакаёвай кватэры ў памеры 30 тысяч рублёў. Гэта тая сума, на якую яны маюць законнае права. Дом, куды яны збіраюцца пераехаць, каштуе прыблізна 100 тысяч беларускіх рублёў. Калі яны сваю кватэру бязвыплатна аддадуць дзяржаве, яны атрымаюць крэдыт 86 тысяч рублёў. Сям'я пагадзілася на такі варыянт. З 1 студзеня яны змогуць атрымаць «мацярынскі капітал», які таксама плануюць укласці ў гэты дом. Калі ўся неабходная сума на дом будзе ў іх на руках, яны пераедуць на новае месца жыхарства.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## Дзіцячае «Еўрабачанне-2019»

# ЗА КРОК ДА ФІНАЛУ

**Ужо ў гэтую нядзелю, 24 лістапада, аматараў дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2019» чакае фінальнае выступленне ўдзельнікаў. Пасля яго і вырашыцца, хто гэтым разам упіша сваё імя ў гісторыю песеннага спаборніцтва.**

Ліза Міснікава выступіць у фінальным канцэрце сёмай. Парадак выступлення канкурсантаў вызначылі падчас жараб'ёўкі на цырымоніі адкрыцця ў Сілезскім тэатры (Катавіцы). Такім чынам мы ўбачым і пачуем выступленні ў наступным парадку: 1. Аўстралія; 2. Францыя; 3. Расія; 4. Паўночная Македонія; 5. Іспанія; 6. Грузія; 7. Беларусь; 8. Мальта; 9. Уэльс; 10. Казахстан; 11. Польшча; 12. Ірландыя; 13. Украіна; 14. Нідэрланды; 15. Арменія; 16. Партугалія; 17. Італія; 18. Албанія; 19. Сербія.

Наша канкурсантка ўжо некалькі разоў адрэпеціравала свой нумар на сцэне песеннага шоу, наведала вечарынку ў еўраклубе, а 23 лістапада Ліза паўдзельнічае ў прэс-канферэнцыі для афіцыйных прадстаўнікоў усіх краін-удзельніц і выступіць ужо на генеральным прагоне гала-канцэрта.



Фінальнае шоу пройдзе ў «Глівіцы-Арэне» пад слоганам «Share the joy!» («Падзяліся радасцю!»), а на лагатыпе — выява паветранага змея з агнямі, што па словах арганізатараў, сімвалізуе свабоду, мір і радасныя імгненні. Вядучымі конкурсу сёлета будуць Іда Навакоўска, Аляксандр Сікора і Раксана Венгель, якая перамагла на дзіцячым конкурсе песні «Еўрабачанне-2018».

Прамая трансляцыя шоу пачнецца ў 18.00 — на «Беларусь 1», «Беларусь 24», а таксама на сайце Белтэлерадыёкампаніі. Каменціраваць шоу традыцыйна будзе журналіст АНТ і вядучы «Беларусь 1» Яўген Перлін.

Нагадаем: у адпаведнасці з правіламі міжнароднага конкурсу сёння можна падтрымаць Лізу Міснікаву, галасуючы за яе кампазіцыю «Попельны» на афіцыйным сайце www.junioreurovision.tv. «Лайкнуць» можна ад трох да пяці выканаўцаў, у тым ліку і прадстаўніка сваёй краіны. Акно для галасавання закрыецца непасрэдна перад фінальным канцэртам 24 лістапада, а па завяршэнні выступленняў зноў адкрыецца на дадатковыя 15 хвілін.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота БТРК.**

## ШАШКІ
(«Звязда») Выпуск № 101

*26-27 кастрычніка 2019 года ў сталічнай СДЮШАР па шахматах і шашках адбыўся традыцыйны турнір па шашках-64 памяці шматразовага чэмпіёна БССР Г. Хацкевіча. У спаборніцтве ўзялі ўдзел ветэраны, якія асабіста ведалі Г. Хацкевіча і гулялі з ім у адных турнірах, а таксама юныя шашысты. Перамог міжнародны майстар Аляксей Куніца — 15 ачкоў з 18 магчымых. На другім месцы неўвядальны гросмайстар Аркадзь Плакхін. Трэцім фінішаваў майстар Дзмітрый Немец — у абодвух па 14 ачкоў.*

Для самастойнага рашэння прапануем кампазіцыі, якія даслаў з Латвіі Генадзь Андрэеў.

№ 76



Белыя простыя шашкі: c7, e5, f6, g3, h4 (5)

Чорныя простыя шашкі: a7, c3, d4, d8, e7, g5 (6)

№ 77

Белыя простыя шашкі: 12, 20, 22, 27, 28, 32, 37, 46 (8)

Чорныя простыя шашкі: 06, 09, 19, 23, 26, 38, 40, 43 (8)

Наступная кампазіцыя складзена па правілах бразільскіх шашак

№ 78

Белыя простыя шашкі: b2, c3, c7, d2, e5, f4, h2 (7)

Чорныя простыя шашкі: a3, a5, b8, d6, f2, g3 (6)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Праверце свае рашэнні:

Выпуск № 99 ад 25.10.2019.

№ 70 1. d2-e3 f4xd2

[1...f4xh2 2. e1xg3 h2xd2 3. d6-e7 f8xf4 4. h4-g5 c3xe5 5. g5xa7 e5-d4 6. a7-b8 d4-c3 7. b8-f4 c3-b2 8. f4-e5]

2. d6-e7 f8xh2 3. e1xg3 h2xf4 4. h4-g5 c3xe5 5. g5xa7 e5-d4 6. a7-b8 d4-c3 7. b8-f4 c3-b2 8. f4-e5 b2-c1 9. e5-f4 c1xg5 10. h6xf4

№ 71 1. e5-f6 c7xg3 2. a5xc7 b8xd6 3. e3-f4 g3xg7 4. h6xc1 c3-b2 5. c1xa3

№ 72 1. d6-e7 b8xb4

[1...f8xb4 2. a5xf8 b8xd6 3. f8xc1 h4-g3 4. c1-e3 g3-h2 5. e3-g1]

2. a5xh6 f8xd6 3. h6xc1 h4-g3 4. c1-e3 g3-h2 5. e3-g1

№ 73 13, 41, 5(41)11, 22, 46+

Выпуск № 100 ад 08.11.19.

№ 74 1. a7-b8 c7xe1 2. g1-f2 f4xd2 3. b8xh2 e1xg3 4. h2xf8 g5xe7 5. f8xf4 + поўнае пабочнае рашэнне c5, b6, f2, b8, f4+ паказаў Л. Жыхар, ён жа піша: «Дзякую нашаму далёкаму армянскаму аўтару за творчасць, што даслаў свае пазіцыі ў вашу газету. Думаю, што гэты факт пацвярджае заслужаны аўтарытэт вашага выдання!»

№ 75 1. b6-c7 b8xf4 2. e1-f2 c3xg3 3. g7-f8 f4xd2 4. f8xh2+

Першымі дакладныя адказы даслалі А. Перхальскі (Глыбокае), А. Маджара (Рэчыца), С. Бурко (Орша), С. Рашэцін (Ашмяны), В. Дударэвіч (вёска Новая Мыш Баранавіцкага раёна), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі, А. Ліцвінаў (усе Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі раён), В. Бандарык (Мінскі раён).

**Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, Мінск, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru**

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**







## Сядзі і глядзі

# Двое на метр квадратны

**На «першай кнопцы» адбылася прэм'ера праекта «Старое-новае». У ім вядучыя паказваюць і распавядаюць, як сваімі рукамі за 48 гадзін зрабіць якасны рамонт самага звычайнага пакоя.**



У кожным выпуску здымачная група будзе адпраўляцца ў госці да новай беларускай сям'і, каб ператвараць квадратныя метры старога пакоя ў сучасную прастору для творчасці, адпачынку, працы і здаровага сну. Аўтары праекта пакажуць, за якімі рашэннямі будучае, а гаспадары ў канцы праграмы змогуць ацаніць выгляд пакоя «да» і «пасля».

Як вядома, ніводзін рамонт не абыходзіцца без канфлікту. Вядучыя праекта Вячаслаў Смола і Вікторыя Кавальчык — людзі розных пакаленняў з абсалютна супрацьлеглымі поглядамі на інтэр'ер. Вячаслаў, як прафесійны дызайнер, расказвае пра сучасныя тэндэнцыі ў абсталяванні жылога памяшкання і тлумачыць, якіх правілаў каманда праекта прытрымліваецца падчас рамонту таго ці іншага пакоя. А вось Вікторыя на фоне імкнення свайго сувядучага ўсё змяніць, наадварот, прыхільніца таго, каб абысціся малымі высілкамі, бо цэніць практычнасць і жыццёвую мудрасць. У выніку іх спрэчак гаспадары кватэры атрымаюць бясплатны рамонт, у той час як гледачоў праграма кожны раз зможа сарыентаваць па кошце праведзеных работ пры жаданні зрабіць такі ж варыянт самастойна.

У кожным выпуску праграмы гледачы таксама атрымаюць парады, як змяніць выгляд сваёй кватэры за невялікія грошы; даведаюцца, як хутка і якасна паклеіць шпалеры, перацягнуць абіўку канапы і нават правільна выбраць выключальнік ці разетку, бо ў тым ліку і з дробязяў фарміруецца дызайн той прасторы, дзе мы жывём.

Яшчэ ў пастаяннай рубрыцы «Зрабі сам» аўдыторыя ўбачыць на практыцы, як з таго, што маецца пад рукой, можна, напрыклад, зрабіць падстаўку для ноўтбука і кубачка з кавай. А рубрыка «Як у людзей» пазнаёміць з беларусамі, якія ўжо маюць у сваіх дамах цікавы інтэр'ер з арыгінальнымі ідэямі ў афармленні.

Стаць героем праекта можа любы жыхар Мінска. Як адзначаюць аўтары праграмы, самае важнае, каб вы былі пазітыўным і цікавым чалавекам, які хоча змяніць выгляд аднаго са сваіх пакояў. Гісторыі пра сябе, сваю сям'ю і жылыя памяшканні можна дасылаць на электронную пошту праграмы fastertomars@gmail.com. Галоўная ўмова — пакой, які вы прапануеце для рамонту, павінен быць не больш чым 15 квадратных метраў.

Глядзіце новыя выпускі праекта «Старое-новае» кожную суботу на «Беларусь 1» у 10.35.

### Бліц-апытанка для вядучага праграмы, дызайнера Вячаслава Смолы:

1. **Мой дом — гэта...** — Для мяне дом з'яўляецца месцам, дзе я адпачываю і аднаўляю сілы.

2. **Самае нечаканае пажаданне, якое вам даводзілася рэалізоўваць для заказчыка?** — Неяк я рабіў дызайн для салона кухоннай мэблі. У заказе, паколькі фірма пазіцыянуе сябе як вытворцу мэблі з экаматэрыялаў, было пажаданне аб'яднаць два памяшканні (у адным планавалася правядзенне розных майстар-класаў, а ў другім будучыя заказчыкі маглі самастойна сабраць «кухню мары»). І нам удалося ажыццявіць гэтую ідэю з дапамогай выяў аленя і льва (іх стварылі з мноства геаметрычных фігур) і перагародкі паміж пакоямі з арнаментам у зялёна-шэрай гаме, якая сімвалізуе экастыль у інтэр'еры.

3. **Галоўная парада тым, хто робіць рамонт самастойна?** — Не зацягвайце гэты працэс на ўсё жыццё, бо галоўнае, каб у доме было камфортна і ўтульна жыць.

4. **Як часта яшчэ можна сустрэць у кватэрах беларусаў рамонт у стылі «хай так»?** — Ужо не так часта, таму што сёння людзі ўсё больш увагі аддаюць дэталям у інтэр'еры і калі, напрыклад, замаўляюць дызайн-праект, то прытрымліваюцца яго да канца.

5. **Найлепшы дызайн для мяне...** — Калі ён базуецца на законах эрганомікі, а не толькі на прыгажосці.

## Закуліссе моднай вытворчасці

**23 лістапада тэлеканал «Беларусь 2» прадставіць у эфіры фэшн-шоу «Подыум» (Расія, 2018), галоўная мэта якога — знаходзіць таленавітых мадэльераў, здатных ствараць арыгінальныя вобразы нават з будаўнічых матэрыялаў ці прадметаў інтэр'еру.**

Праграма «Подыум» для дызайнераў адзення, якія пачынаюць свой шлях у прафесіі, адаптацыя амерыканскага шоу «Project Runway». У кожным выпуску ўдзельнікі ствараюць па два строі: адзін — у экстрэмальных умовах і з незвычайных матэрыялаў, напрыклад, з прадметаў інтэр'еру, а другі на зададзеную тэму — са звыклай тканіны, але на работу даецца вельмі мала часу. Так, канкурсантам трэба будзе «сканструяваць» купальнік з вячэрняй сукенкі, не здымаючы яго з мадэлі і выкарыстоўваючы толькі нажніцы. У прэм'ерным выпуску шоу гледачы «Беларусь 2» убачаць першыя выпрабаванні і самыя цікавыя моманты кастынгу, падчас якога вызначацца 12 канкурсантаў. Сярод іх і эпатажныя асобы ў свеце моды, і нікому не вядомыя таленты. Па словах арганізатараў, узрост удзельнікаў і наяўнасць у іх профільнай адукацыі не маюць значэння. Бо галоўнае патрабаванне — уменне шыць сваімі рукамі. Ацэньваць работы будуць вядомыя дызайнеры на чале з экспертам высокай моды Валянцінам Юдашкіным і «зорныя» госці. Вядучыя шоу — мадэль і блогер Марыя Мінагарава.

**Алена ДРАПКО.**

## панядзелак, 25 лістапада



### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 23.50** «Зона Х» (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.20** Навіны надвор'я.
**10.40, 19.50 Сіткам «Слуга народа» (16+).**
**12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Пайсці, каб вярнуцца» (12+).**
**13.05 Меладрама «Самае галоўнае» (12+).**
**14.50, 15.25 Меладрама «Трэцяя спроба» (12+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**21.50 Серыял «След» (16+).**
**23.30** Арэна.
**0.15** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 18.35** Тэлебарометр.
**9.05, 20.05 Серыял «Зразумець. Даравацьb» (16+).**
**10.15** Капейка ў капейку (12+).
**10.55** Камень, нажніцы, папера (16+).
**11.30** «Да пабачэння!» (16+)
**12.25 Меладрама «Дзень працы» (12+).**
**14.25** М/с «Чарапашкі-ніндзя» (12+).
**15.10** Анімацыйны фільм «Кот у ботах» (12+).
**16.30 Баявік «Паркер» (16+).**
**19.15** Суперлато.
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.15** «Тата папаў» (16+).
**23.35** «Хадзі сюды і танцуй».
**23.40** «Арол і рэшка. Перазагрузка» (16+).
**0.35 Серыял «Жаночы доктар-3» (16+).**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Булдава.
**8.05, 12.00, 20.15** Навіны культуры.
**8.25, 12.20, 20.35** Гэты дзень.
**8.30** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.25, 21.05** «Апошні дзень». Ілья Алейнікаў (12+).
**10.00, 22.50 «Талаш». Маст. фільм. 1-я серыя (16+) [СЦ].**
**10.55** «Беларуская кухня». Раўгеня з блінамі на калодзе.
**11.20, 16.50** «Сталінградская бітва». Фільм першы «Пачатак» (12+).
**12.25** «Наперад у мінулае».
**12.55 «Дзікае паляванне караля Стаха». Драма (12+) [СЦ].**
**15.10** «Навукаманія» (6+).
**15.40, 21.40 «Соль зямлі». Маст. фільм (12+).**
**17.25 «Расклад на паслязаўтра». Меладрама (12+).**
**18.55** «Яўген Глебаў. Музыка да кінафільмаў». Канцэрт.
**20.00** «Архітэктура Беларусі».
**20.40** «Калыханка» (0+).

### Беларусь 5

**7.00** Азбука спорту.
**7.10** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Хімкі» (Маскоўская вобл.) — «Цмокі-Мінск».
**8.55** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Брэст) — ФК «Віцебск».
**10.50** Вынікі тыдня.
**11.35** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. БАТЭ (Барысаў) — «Дынама-Мінск».
**13.30** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Агляд тура.
**14.15** Вялікі спорт.
**14.55** Пляжны футбол. Чэмпіянат свету. Беларусь — Сенегал.
**16.20** Трэніровачны дзень.
**16.50** Пляжны футбол. Чэмпіянат свету. Расія — ААЭ.
**18.15** Гульні «навырост».
**18.50** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Юнацтва-Мінск». (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**21.10** «Вось гэта спорт!»
**21.20** Кікнадзэ. Меркаванне.
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**22.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Астан Віла» — «Ньюкасл». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

### АНТ

**6.00, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**7.00** [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
**9.10** «Контуры».
**10.00** «Жыць здорава!» (16+)
**11.10 Серыял «Я вярнуся» (16+).**
**12.05** «Модны прыгавор» (6+).
**13.10 Серыял «Шчаслівы білет» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20, 0.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20, 23.15** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**18.55** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.10 «Нішто не здараецца двойчы». Серыял (16+).**

### СТБ

**6.00, 6.40, 7.45** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**8.40** «Тыдзень».
**10.15** «Вадзіць па-руску» (16+).
**10.40 «Маскоўская барзая». Серыял (16+).**
**12.20** «Вадзіць па-руску» (16+).
**12.40, 21.15, 23.50** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 20.30** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.05** «Як уладкаваны свет» (16+).
**16.00, 16.50 «Вышук-3». Серыял (16+).**
**20.00, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Міншчына».
**22.00** «Глядзець усім!» (16+)
**0.35** «Самая карысная праграма» (16+).

### МІР

**6.00, 10.10 Серыял «Заказаныя жанчыны» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.45** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Зала суда. Бітва за грошы» (16+).
**14.10** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 19.25 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.55** «Гульня ў кіно» (12+).
**20.45** «Сусветныя гульні розуму» (0+).
**21.15, 0.00 Серыял «1942» (16+).**
**0.35** «Такому мама не навучыць» (12+).
**1.00 Серыял «Ніканаў і Ко». 1—4-я серыі (16+).**
**4.10 Серыял «Паляўнічыя на дыяменты». 1—3-я серыі (16+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.25** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.35** «Наша справа» (16+).
**13.00** «У людзях».
**13.35** «Плюс-мінус». Надвор'е на тыдзень.
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35, 22.25, 23.10** «Хто супраць?» Ток-шоу.
**17.25** «60 хвілін». Ток-шоу.
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.40 Серыял «Тайны следства-18» (12+).**
**0.25** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** Белавежская пушча (6+).
**6.25** «50 рэцэптаў першага» (12+).
**7.10** «Здароўе» (12+).
**8.05, 10.20 Серыял «Кодэкс гонару» (16+).**
**10.20** «Чакай мяне» (12+).
**11.15** «Ты не паверыш!» (16+)
**11.55 Серыял «Ляснік. Свая зямля» (16+).**
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00** Пракурорская праверка (16+).
**15.10, 16.30 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**16.25, 19.40, 23.20** Сёння. Галоўнае.
**17.50** «ДНК» (16+).
**19.55, 22.25 Серыял «Пяць хвілін цішыні. Вяртанне» (12+).**
**22.00** «НЗ.by».
**23.35 Серыял «Версія» (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.55, 18.25, 21.05, 0.00** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.10, 16.05** М/с «Чып і Дэйл спяшаюцца на дапамогу».
**7.35, 16.00** «Гумарынка».
**7.40 Дэтэктыў «Мегрэ расстаўляе пасткі» (16+).**
**9.10** Дак. серыял «Гарады з гісторыяй» (12+).
**9.40, 18.30 Серыял «Павук» (16+).**
**11.30 Баявік «Праўдзівая хлусня» (16+).**
**13.50, 20.05 Серыял «Містар Робат» (16+).**
**14.40 Серыял «Гатэль «Дэль Месяц» (12+).**
**16.10 Серыял «Агент Мак Гайвер» (16+).**
**17.40, 23.15 Серыял «Імперыя» (16+).**
**20.55** «Вечарніца» (0+).
**21.10 Драма «Аперацыя «Валькірыя» (16+).**

## нядзеля, 1 снежня



### ВТБ

**6.05** «Лаві момант» (16+).
**7.20** «Дурні і дарогі» (16+).
**8.25** «Наш рамонт» (16+).
**9.15** М/ф «Чароўная кніга» (0+).
**9.30** М/ф «Пацяшоба» (0+).
**9.50** М/ф «Царэўна» (6+).
**10.15** М/ф «Качыныя гісторыі» (0+).
**10.45** «Саранхэ» (16+).
**11.45** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**12.20** Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
**14.45** Баявік «Нястрымныя-3» (16+).
**17.15** Анімацыйны фільм «Оз: вяртанне ў Ізумрудны горад» (0+).
**19.00** «Форт Баярд» (16+).
**20.35** «Уральскія пельмені» (16+).
**22.10** Фэнтэзі «Апошні паляўнічы на ведзьмаў» (16+).
**0.10** Серыял «Метад Лаўровай» (16+).
**2.05** «Проста кухня» (16+).
**2.34** Скетч-шоу «Даеш моладзь» (16+).
**4.15** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).

### Культура

**6.30** «Эфект матылька». Дак. серыял [СЦ].
**7.05** «Дзве казкі», «Брыдкае качаня». М/ф.
**7.40** «Адмірал Нахімаў». Маст. фільм.
**9.10** «Звычайны канцэрт».
**9.35** «Мы — грамацеі!»
**10.15, 0.45** Да юбілею Галіны Польскіх. «Рассмяшыце клоўна». Маст. фільм.
**12.30** «Пісьмы з правінцыі». Барысаглеб (Яраслаўская вобласць) [СЦ].
**13.00, 0.05** Дыялогі пра жывёл. Лора Парк. Тэнэрыфэ [СЦ].
**13.40** «Іншыя Раманавы». «Другі цэсарэвіч» [СЦ].
**14.10** «Мікалай Панамароў-Сцяпной. Дзевяцьдзесятых, або Паралельная фантастыка». Дак. фільм [СЦ].
У разлікова-даведачным цэнтры запэўнілі, што не ставяць мэту як мага больш выселіць неплацельшчыкаў. Важней спагнаць з іх запазычанасць, дабіцца аплаты плацяжоў. Многія жыхары, апынуўшыся адной нагой на вуліцы, самі стараюцца выйсці з гэтай сітуацыі, каб не давесці справу да суда. Бо меры і сапраўды жорсткія. Напрыклад, у адносінах да арэнднага жылля хапае двух месяцаў, каб рыхтаваць матэрыял на высяленне.

За дзевяць месяцаў у суд пададзена больш за 100 адпаведных іскаў. У 19 выпадках суд прыняў рашэнне выселіць нядбайных жыхароў. Яшчэ чацвёра пераехалі ў памяшканні меншай плошчы. Летась у судзе было разгледжана больш за 120 іскаў.

Да ўласнікаў кватэр прымяняюцца папераджальныя меры. Калі гаспадар доўгі час не плаціць за кватэру, яму могуць адключыць святло, газ і ваду. Сёлета такія меры напаткалі паўсотні ўласнікаў кватэр.

Усяго на абслугоўванні адзінага разліковa-даведачнага цэнтра знаходзіцца 75 тысяч кватэр ведамаснага жыллёвага фонду. Гэта кватэры, якія належаць дзяржаве. Большасць наймальнікаў, безумоўна, народ дысцыплінаваны і плаціць за паслугі своечасова. Але ні многа, ні мала — пяць тысяч жыровак застаюцца неаплачанымі.

Пераважная большасць даўжнікоў не плаціць за камунальныя паслугі ад аднаго да трох месяцаў. Камунальныя службы на кожную затрымку рэагуюць аператыўна. Спачатку папярэджваюць, тэлефануюць, напамінаюць. І гэта прыносіць свой плён. Ужо на гэтым этапе большасць жыровак аплачваецца. Калі ж такія лагодныя меры не дзейнічаюць, пачынаецца наступны этап. Спецыялісты разлікова-даведачнага цэнтра афармляюць выканаўчыя надпісы і падаюць даныя для адключэння камунальных паслуг. Высяленне — самая крайняя мера.

Увогуле, камунальныя службы гатовы аказаць неплацельшчыкам дапамогу ў працаўладкаванні, каб яны маглі разлічыцца з даўгамі і не аказацца на вуліцы. Але практыка паказвае, што злосныя неплацельшчыкі акязваюцца яшчэ і дармаедамі, якія ігнаруюць усе прапановы паправіць сваё матэрыяльнае становішча.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

У ТЭМУ

## Новы фармат

**У Гродне актыўна ўкараняюцца электронныя жыроўкі**

Як паведамілі ў адзіным разлікова-касавым цэнтры горада, такой паслугай карыстаецца каля чатырох тысяч уласнікаў кватэр з 76 тысяч. Пакуль працэнт электронных жыровак невысокі, але ён пастаянна расце. Такім чынам плацельшчык мае магчымасць аформіць жыроўкі ў электронным выглядзе і адправіць на адрас электроннай пошты.

Гэты від аплаты мае шэраг пераваг, упэўнены ў разлікова-касавым цэнтры. Па-першае, зручна самім жыхарам, якім не трэба стаяць у чэргах, каб заплаціць камунальныя плацяжы. Жыроўка дойдзе ім нямнога хутчэй, чым адрасатам папяровых версій. Да таго ж такі варыянт значна эканоміць бюджэт, бо штомесяц на выраб апошніх траціцца амаль чатыры тысячы рублёў.

Спрасцілася і сама працэдура пераходу на электронны носьбіт. Напрыклад, летась для гэтага трэба было прыйсці ў Цэнтр і напісаць заяву. Сёлета прадпрыемства адкрыла электронную старонку рэгістрацыі, а таксама «асабісты кабінет».

СУД ДЫ СПРАВА

# МЕТРЫ РАЗЛАДУ



## Пагадненне аб карыстанні жыллём можа выратаваць ад доўгіх судовых цяжбаў, зберагчы спакой і здароўе

**Калі звяртаешся да судовых спраў, пра якія пойдзе гаворка ніжэй, зноў і зноў прыгадваецца булгакаўскае «Людзей сапсавала кватэрнае пытанне». Відаць, большая частка іскаў грамадзян адно да аднаго датычыцца жылля, яго дзяльбы, высялення і засялення, выдзялення долі ў карыстанні. Усе падобныя справы разглядаюцца на падставе Жыллёвага кодэкса краіны, новая рэдакцыя якога ўступае ў сілу 1 студзеня будучага года. Артыкулы і палажэнні кодэкса час ад часу змяняюцца. Нязменнымі застаюцца праблемы, якія заканадаўства вымушана рэгуляваць. Таму многія рэчы грамадзянам варта ведаць загадзя, перш чым выбудоўваць адносіны са сваякамі.**

### Падарыўшы — не вернеш

Так здараецца, што грамадзяне прэтэндуюць на жыллё, якога яны па ўсіх мерках не заслугоўваюць, а некаторыя, наадварот, пазбаўляюцца сваіх метраў па неабачлівасці альбо з прычыны няведання законаў. Даволі часта здараюцца разборкі, калі старэйшы сваяк перапіша кватэру на маладога ў спадзяванні, што былога гаспадара будуць даглядаць да самай яго смерці ў знак удзячнасці за жыллё. Але так можа і не стацца. І гэта ўжо катэгорыі маральныя. А паводле закона, кватэра належыць новаму гаспадару, які будзе распараджацца ёй і паводзіць сябе так, як палічыць патрэбным. Тады, спахапіўшыся, былы ўласнік, бывае, бяжыць у суд, просіць: «Вярніце мне маё!» Але такое часцей за ўсё становіцца немагчымым, калі не было заключана пісьмовае пагадненне. Пра апошняе людзі, як правіла, забываюць.

Яшчэ адзін невясёлы сюжэт развіваецца, калі людзі не заключаюць шлюб у загсе, а жывуць у грамадзянскім шлюбе. Скажам, памерла грамадзянская жонка нейкага грамадзяніна К., а яе дзеці ўзялі і выставілі гэтага грамадзянскага ўдаўца за дзверы. А ён сам хворы, ісці яму няма куды, родныя дзеці не раскрываюць абдымкаў бацьку, які шмат гадоў утрымліваў кватэру чужой цёткі, вёў сумесную з ёй гаспадарку. Даказаць у судзе свае правы гэтаму ўмоўнаму грамадзяніну К. будзе не проста. А ўсё таму, што загадзя не паклапаціўся пра фармальнасці.

### Адмовіцца ад сваяцтва

Калі «засвеціць» нейкая нерухомасць альбо хоць бы доля на яе, людзі, бывае, забываюць і пра сваяцтва, не зважаюць на маральныя прынцыпы. Не так даўно ў адным сельсавеце расказвалі, як сястра з братам дзялілі бацькоўскую хату. Згаданыя сваякі ўжо даўно пенсіянеры. А некалі падчас выдачы пасведчання аб нараджэнні была дапушчана памылка. У дакуменце, які выдалі брату, прозвішча адрознівалася адной літарай ад бацькавага. Напрыклад: Адамовіч і Адамковіч. Але ж чалавек не зважаў, пражыў век з гэтым прозвішчам. Сястры ж нехта падказаў варыянт, і вясковая жанчына рашыла пакінуць бацькоўскі дом сабе цалкам. Калі суддзя падчас пасяджэння спытаў яе, паказваючы на брата: «Хто гэта?», жанчына без ценю сумнення адказала: «Не ведаю». Усе вяскоўцы да гэтай пары з абурэннем прыгадваюць тую гісторыю. Суд прыслухаўся да паказанняў сведак, якіх можа быць цэлая вёска. Але ж сам факт красамоўна сведчыць пра тое самае пытанне, якое папсавала людзей. І ўжо ўнучка, якая прыязджае першы раз у дом бабулі толькі пасля яе смерці, каб заявіць свае правы на метры, нікога не здзіўляе. Так што трэба кватэрнае пытанне вырашаць загадзя.

### Калі былога не выселіш

Некалькі гадоў таму мне давялося пісаць пра адну жыццёвую гісторыю брастаўчанкі, у многім тыповую. Адразу пасля заключэння шлюбу яна зарэгістравала мужа ў кватэры, якую купіла самастойна нашмат раней. Не вельмі каб шчаслівым аказалася тое сямейнае жыццё, калі праз паўтара года яны вырашылі расстацца. Развод афармілі як і шлюб, у вызначаным законам парадку.

> Варта помніць, што нават не вельмі прыемная размова з новым родзічам лепш, чым судовыя цяжбы з невядомым фіналам.

Ну, вядома, жонка спадзявалася, што экс-муж збярэ чамаданчык ды ціха сыдзе з яе жыцця. Каб паскорыць працэс, яна нават замкі змяніла ў кватэры. Толькі ў мужа былі іншыя планы. Ён падаў у суд. Апошні ў сваю чаргу, яму, як былому члену сям'і, выдзеліў пакой, у якім ён можа пражыць хоць да скону. А другі суд абавязаў экс-жонку выдаць ключы ад уваходных дзвярэй, ды яшчэ спагнаў з яе на карысць былога мужа пэўную суму, якую ён патраціў на адваката.

Такі закон. Для нашага чалавека ненатуральным выглядае пры прапісцы мужа альбо жонкі падпісаць пагадненне аб карыстанні жыллём. І дарэмна, пра наяўнасці такога пагаднення ў выпадку скасавання шлюбу кожны застаўся б з чым быў. А так муж быў прапісаны як член сям'і, і гэта дало яму правы.

За апошнія сем гадоў Жыллёвы кодэкс мяняўся, удасканальваўся, некаторыя спрэчныя пытанні цяпер вырашаюцца інакш. І ўсё ж вырашаюцца яны вельмі і вельмі складана.

Каб упэўніцца ў сказаным, можна пайсці ў любую бібліятэку, наведаць там Цэнтр прававой інфармацыі, зайсці ў электронны банк даных прававой інфармацыі Беларусі «Эталон» і азнаёміцца са шматлікімі прыкладамі з судовай практыкі краіны. Дык вось менавіта ў згаданым раздзеле аўтар гэтых радкоў прачытала вытрымкі са справы, якая цягнулася даволі доўга, але скончылася на карысць заяўніцы, маці сямейства. Жанчына з мужам даўно ў разводзе, пабудавала кватэру пасля спынення сумеснага жыцця з бацькам сваіх дзяцей. Але скарыстаўшыся тым, што дагавор на будаўніцтва жылля быў заключаны гаспадыняй на некалькі месяцаў раней, чым пастанова аб скасаванні шлюбу, былы муж праз многа гадоў падаў у суд і патрабаваў засяліць яго ў спрэчную кватэру. Адказчыца прадставіла ўсе дакументы аб тым, што яна сама аплачвала будаўніцтва жылля, і суд палічыў гэты факт даказаным. Яму адмовілі ў засяленні.

Ёсць і другі факт, калі домаўладальнікі не змаглі выселіць былую нявестку са сваёй кватэры. Іх сын скасаваў шлюб з жонкай, але ў кватэры застаўся зарэгістраваны ўнук. І паколькі, згодна са шлюбным кантрактам сям'і, якая распалася, сын застаецца жыць з маці, яна мае права пражываць разам з дзіцем да яго паўналецця. Хоць па іншых дакументах жанчына не мае ніякага права на гэтыя квадратныя метры.

### Лепш дакумент, чым суд

Сапраўды самымі складанымі выглядаюць справы, калі яны датычацца высялення былых мужоў, жонак, зяцёў, нявестак. Потым ён горка пашкадуе, а вось напісаць у пагадненні аб парадку карыстання жыллём, што сваяк рэгіструецца на час шлюбу, для нашага чалавека амаль што азначае прызнанне гэтага шлюбу часовым. Але ж можна ў ЖЭСе альбо ў старшыні кааператыва заключыць пагадненне спачатку на пэўны тэрмін: на год, два, пяць. Не саромеюцца ж работадаўцы браць спецыяліста альбо рабочага на працу з выпрабавальным тэрмінам. Дык чаго ж саромецца тут, калі рэгіструеш у сваім жыллі зяця, нявестку, а то і мужа альбо жонку? Час пакажа, працягваць тэрмін пражывання ці не. І нават запіс «на час шлюбу» не выглядае абразлівым, калі шлюб заключаецца на ўсё жыццё. Проста загадзя трэба абгаварыць гэтыя моманты з чалавекам і рабіць усё цывілізавана, не асабліва зважаючы на эмоцыі, рэплікі, паводзіны таго, хто ўсяляецца. Заўсёды можна сказаць яму, што ў сваё ўласнае жыллё ён зможа ўсяляць каго захоча і як захоча, а тут хай выконвае правілы гульні гаспадара.

І яшчэ. Варта помніць, што нават не вельмі прыемная размова з новым родзічам лепш, чым судовыя цяжбы з невядомым фіналам. Некаторыя гаспадары кватэр гадамі, а то і дзесяцігоддзямі пакутуюць побач з былымі сваякамі. Гэта перарастае ў зацяжныя канфлікты, сапраўдныя войны, у выніку якіх трацяцца спакой, сілы і здароўе. Таму лепей усё ж улічваць магчымыя рызыкі загадзя.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**о проведении повторного открытого аукциона по продаже объектов государственной собственности и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества**

**Организатор аукциона:** комитет государственного имущества Минского городского исполнительного комитета, г. Минск, ул. Герцена, 2А, каб. 2, тел.: (017) 289 11 27, (017) 200 20 89, (017) 222 44 69.

Аукцион состоится **6 декабря 2019 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

На аукцион выставляется:

| | |
|---|---|
| **Сведения о предмете аукциона, место нахождения имущества** | Незавершенные незаконсервированные капитальные строения по ул. Карвата, 99/16, 99/17, 99/18 в г. Минске и право заключения договора аренды земельного участка для их обслуживания:<br>– незавершенное незаконсервированное капитальное строение по ул. Карвата, 99/16: общая площадь здания – 10 464,6 кв. м; фундамент – железобетон; наружные стены – блоки стеновые из ячеистого бетона, железобетон; внутренние стены – блоки стеновые из ячеистого бетона; перегородки – кирпичи; перекрытия – железобетон; крыша – рулонные кровельные материалы; готовность – 25 %;<br>– незавершенное незаконсервированное капитальное строение по ул. Карвата, 99/17: общая площадь здания – 47,3 кв. м; фундамент – железобетон; наружные и внутренние стены – кирпичи; перегородки – кирпичи; перекрытия – плита железобетонная; крыша – металл; полы – бетон; готовность – 85 %;<br>– незавершенное незаконсервированное капитальное строение по ул. Карвата, 99/18: общая площадь здания – 46 кв. м; фундамент – железобетон; наружные и внутренние стены – кирпичи; перегородки – кирпичи, перекрытия – плита железобетонная; крыша – металл; полы – бетон; электроснабжение – централизованная система; готовность – 95 %; |
| **Начальная цена предмета аукциона** | 2 398 602 рубля 68 копеек (из них: начальная цена имущества – 1 900 601 рубль 30 копеек (с понижением на 80 %), начальная цена права заключения договора аренды земельного участка – 498 001 рубль 38 копеек) |
| **Информация о земельном участке для обслуживания продаваемого имущества** | Земельный участок площадью 2,2126 га с кадастровым номером 500000000001035229, в том числе с ограничениями в использовании земель: 0,0580 га – охранные зоны линий связи и радиофикации, 0,0780 га – охранные зоны электрических сетей напряжением до 1000 вольт.<br>Вид вещного права на земельный участок – право аренды; срок аренды – 5 лет со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо признании аукциона несостоявшимся |

| | |
|---|---|
| **Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета** | 479 000 рублей до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с BY13AKBB 36429000008700000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код AKBBBY2X, УНП 100048181 комитета государственного имущества Минского городского исполнительного комитета,<br>назначение платежа – задаток для участия в аукционе |

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, ул. Герцена, 2А, каб. 2, по рабочим дням с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Последний день приема заявлений – 5 декабря 2019 г. до 16.00.**

Извещение о проведении аукциона ранее опубликовано в газете «Звязда» от 15.10.2019 № 196 (29063).

В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола победитель аукциона (единственный участник несостоявшегося аукциона) обязан внести плату (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения Минским городским исполнительным комитетом) за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка. Размер возмещаемых затрат доводится до сведения участников аукциона до начала его проведения.

После совершения победителем аукциона (единственным участником аукциона) указанных действий и представления организатору аукциона, продавцу и в Минский городской исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона продавцом заключается договор купли-продажи имущества. В тот же срок Минский городской исполнительный комитет передает победителю аукциона (единственному участнику аукциона) выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает экземпляр протокола и заключает с ним договор аренды земельного участка.

Информация об аукционе и предмете аукциона дополнительно размещена на официальных интернет-порталах Минского городского исполнительного комитета **(www.minsk.gov.by)** и Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **(www. gki.gov.by)**.



Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Червенское райпо, Минская обл., г. Червень, ул. Ленинская, 32 |

**Предмет аукциона**

| **Наименование** | **Общая площадь** | **Инвентарный номер** | **Адрес** |
|---|---|---|---|
| **Склад для хранения тары** | 1299,5 кв. м | 615/С-39498 | Минская обл., Червенский р-н, г. **Червень**, ул. Ленинская, д. 32Б |

Составные части и принадлежности: навес

***Сведения о земельном участке***: пл. **0,3383** га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания материально-технической базы

**Начальная цена с НДС 20 % – 78 659,50 бел. руб.** (снижена на 50 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи – 10** рабочих дней после проведения аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущие извещения о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 05.11.2019

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Дата и время проведения аукциона: 03.12.2019 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 02.12.2019 до 17.00** по указанному адресу. **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

**Извещение о проведении
4 декабря 2019 года аукциона по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества открытого акционерного общества «Общепит «Школьник»**

| | | |
|---|---|---|
| **1. Наименование объекта и его место нахождения** | Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-90337, г. Барановичи, ул. Чернышевского, 69Л | Часть капитального строения с инвентарным номером 110/С-90997 по адресу: г. Барановичи, ул. Красноармейская, 21 |
| **2. Арендуемая площадь, м²** | 139 | 110,7 |
| **3. Характеристика объекта** | Имеется электроснабжение, развитая транспортная инфраструктура | Имеется электроснабжение, водоснабжение, отопление, телефон, развитая транспортная инфраструктура |
| **4. Начальная цена продажи** | 34,75 | 27,675 |
| **5. Сумма задатка, базовых арендных величин** | 3,475 | 2,7675 |
| **6. Условия аукциона** | Организация деятельности, предусмотренной законодательством Республики Беларусь, в соответствии с санитарными нормами и противопожарными требованиями, за исключением размещения игорных заведений. Предоставление Арендодателю права доступа в электрощитовую для снятия показаний | Организация розничной торговли непродовольственной группой товара в соответствии с санитарными нормами и противопожарными требованиями |
| **7. Срок аренды капитальных строений** | 3 года | 3 года |
| **8. Коэффициент к базовой ставке арендной платы** | - 0,8 - | -2- |
| **9. Размер уплачиваемого штрафа, базовых величин** | 30 | 30 |

**Аукцион состоится 4 декабря 2019 года в 12.00 по адресу: г. Барановичи, ул. Красноармейская, 4, (2-й этаж).**
Арендодатель: ОАО «Общепит «Школьник» Брестская обл., г. Барановичи, ул. Красноармейская, 4.
Организатор аукциона – ОАО «Общепит «Школьник».
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: 225409, г. Барановичи, ул. Красноармейская, д. 4, каб. 7 ОАО «Общепит «Школьник» с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 в рабочие дни по 3 декабря 2019 г. включительно (3 декабря 2019 г. – до 16.00). Контактный телефон в г. Барановичи (0163) 64 19 64.
Для участия в аукционе в срок, указанный в извещении, подать заявление на участие в аукционе с приложением следующих документов: копию платежного поручения либо иного документа о перечислении суммы задатка на расчетный р/счет BY02BLBB30120200167591001001 в ЦБУ № 405 ОАО «Белинвестбанк» г. Барановичи, БИК BLBBBY2X, г. Барановичи, ул. Димитрова,15, УНП 200167591, ОКПО 01567973 с отметкой банка и другие документы, указанные в извещении, опубликованном в газете «Звязда» № 154 от 16.08.2019.
К участию в аукционе допускаются лица, перечисленные выше, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю) обязан:
– в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона в установленном порядке перечислить на расчетный счет ОАО «Общепит «Школьник» сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной суммы задатка, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона. Оплата предмета аукциона осуществляется в белорусских рублях в зависимости от размера базовой арендной величины, установленной на день оплаты;
– в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола заключить договор аренды с арендодателем. В случае невыполнения одного из условий, результаты аукциона аннулируются, внесенный задаток победителю аукциона (лицу, приравненному к победителю) не возвращается.
Полная информация об условиях участия в аукционе и иные сведения ранее опубликованы в газете «Звязда» № 154 от 16.08.2019.
Информация о проведении аукциона размещена на сайте арендодателя: общепитшкольник.бел

**РУП «Институт недвижимости и оценки»
извещает о проведении открытого аукциона по продаже автомобиля, принадлежащего Инспекции МНС по г. Барановичи**

**Лот № 1**. Согласно свидетельству о регистрации (тех. паспорту): легковой седан (SEDAN)SKODA SUPERB ЭЛЕГАНС, кузов (рама) №TMBBT23U269121451, г. в. – 2006, цвет – темно-серый металлик. Местонахождение: г. Барановичи, ул. Ленина, 69. **Начальная цена без НДС** – 4 963,18 бел. руб. **Задаток** – 500,00 бел. руб. **Шаг аукциона** – 5 %.
**Условия аукциона**: 1. Заключить с Продавцом договор купли-продажи в течение 3 (трех) рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. 2. Оплатить Продавцу стоимость Объекта в день подписания договора с момента заключения сторонами договора купли-продажи. 3. Оплатить стоимость услуги и стоимость затрат Организатора аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Размер штрафа в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 составляет 1 000,00 белорусского рубля.
**Аукцион состоится 23.12.2019 в 15.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.**
Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
**Продавец:** инспекция МНС по г. Барановичи, 225404, г. Барановичи, ул. Ленина, 69, тел. 8 (0163) 67-16-00. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 23.12.2019. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00 с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 19.12.2019 в 11.00. Организатор торгов вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения. Контактное лицо для осмотра Объекта: Сорговицкий Сергей Васильевич, тел. 8 029 (380 78 63)

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-59 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

# ДОБРААХВОТНА НЕЛЬГА ПРЫМУСОВА

**Як у Траянаўцы талакой ставяць на шлях выпраўлення аматара выпіўкі**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.
Фота носіць ілюстрацыйны характар.

***«Да вас звяртаюцца члены праваабарончай арганізацыі, неабыякавыя да чужой бяды людзі. Пачынаючы з красавіка, мы сочым за лёсам Віктара Д. (прозвішча з этычных прычын не называем. — «МС») , былога работніка аграрна-жывёлагадоўчай гаспадаркі «Траянаўка» Барысаўскага раёна. Ён з пятнаццаці гадоў працаваў пастухом, а пасля на ферме. Вясной у яго памерла маці. Пасля яе пахавання ў сына пачаліся збоі ў рабоце — стаў піць. Кіраўніцтва гаспадаркі звальняла яго разы са тры і брала зноў. А затым развіталіся з ім канчаткова. Віктар стаў дэкласаваным элементам, можна сказаць, бамжом. Заклапочаныя яго далейшым лёсам людзі званілі, пісалі кіраўніцтву, прасілі аднавіць на рабоце, даць тэрмін для выпраўлення. Гэтыя просьбы былі праігнараваныя. Сёння мужчына застаўся без сродкаў да існавання. Лета выжыў за кошт збору грыбоў і апрацоўкі агародаў пенсіянерам. А што будзе зімой? Просім дапамагчы вярнуць работніка назад». Такое пісьмо атрымала рэдакцыя.***

## Галоўнае патрабаванне — дысцыпліна

Пісьмо, дарэчы, ананімнае, без подпісаў, зваротнага адрасу, кантактных даных. Таму мы не змаглі звязацца з «праваабаронцамі». Патэлефанавалі **намесніку генеральнага дырэктара па сельгасвытворчасці аграрна-жывёлагадоўчай гаспадаркі «Траянаўка» ААТ «БАТЭ» — кіруючая кампанія холдынга «Аўтакампаненты» Уладзіміру НЕСЦЯРОНКУ.** «Прыязджайце, калі ласка, нам няма чаго ўтойваць, усё пакажам і раскажам», — запрасіў Уладзімір Мікалаевіч.

Дарога да цэнтральнай сядзібы сельгасарганізацыі — няблізкая, шэсцьдзясят кіламетраў. Гэта самая аддаленая гаспадарка ў Барысаўскім раёне.

У красавіку 2011 года Уладзімір Несцяронак прыняў яе ў дрэнным стане: надоі на карову былі на ўзроўні 3,5 тысячы літраў малака, ураджайнасць збожжавых — 19 цэнтнераў з гектара. Асабліва адчуваўся недахоп спецыялістаў — ні заатэхніка, ні ветурача. Пачыналі падымаць гаспадарку на той час з аграномам, а цяпер **кіраўніком аграрна-жывёлагадоўчай гаспадаркі Уладзімірам ГУДЗЕМ.**

Зараз гаспадарка стабільна займае другое-трэцяе месцы ў раёне. Ураджайнасць збожжавых павысілася да 33 цэнтнераў з гектара, налета плануюць атрымаць па сем тысяч літраў малака на карову. У рэйтынгу надояў у разліку на адну «рагулю» па краіне яны ў першай сотні — 48 месца.

— Маё самае галоўнае патрабаванне было і застаецца нязменным — працоўная і тэхналагічная дысцыпліна, — кажа Уладзімір Мікалаевіч. — Без гэтага нельга дасягнуць вынікаў. — Да майго прыходу ў гаспадарцы квітнелі п'янства і разгільдзяйства. З тымі, хто не стаў на шлях выпраўлення, развіталіся.

## Атрымаў зарплату — выпіў, страціў работу

— У нас створаны належныя ўмовы для працы. Хто хоча працаваць, той працуе і зарабляе, — лічыць Уладзімір Гудзь. Што датычыцца Віктара Д., то ў пісьме сітуацыя прадстаўлена ў іншым святле, чым ёсць на самай справе. На работу яго прынялі 14 чэрвеня 2016 года, звольнілі 25 красавіка 2019-га па пагадненні бакоў. За гэты час Віктар Д. здзейсніў пятнаццаць прагулаў. У выніку, каб іх закрыць, давалі яму дні водпуску за ўласны кошт, даравалі, думалі, што выправіцца. Але безвынікова. Апошняй кропляй цярпення стала, калі ён апоўначы пакінуў без догляду кароў на пашы і сышоў. Статак знайшлі раніцай за тры кіламетры ад пашы. У выніку мы недабралі каля 10 тон малака.

Акрамя таго, мужчыну неаднойчы кіраўніцтва спрабавала закадзіраваць, але ён катэгарычна адмаўляўся. Хто хацеў прайсці кадзіраванне, той гэта зрабіў, тым больш што гаспадарка да раённай паліклінікі падвозіла ўсіх ахвотных сваім транспартам.

## Ці ёсць дарога назад?

Пацікавілася я і бытам Віктара Д. «А вы самі з'ездзіце і паглядзіце», — пагадзіўся паказаць мне дарогу Уладзімір Гудзь. Ён застаўся ў машыне, каб не бянтэжыць сваёй прысутнасцю гаспадара.

Насустрач мне выйшла жанчына, якая прадставілася сужыцелькай Віктара, на добрым падпітку.

У двары — беспарадак, у хаце — антысанітарыя. Сіратліва глядзіцца паўразбураны хлеўчык.

— Гаспадара няма дома, дапамагае людзям у суседняй вёсцы, — растлумачыла суразмоўніца. — У нас ёсць конь і жарабя. Але восеньскія работы ў вяскоўцаў хутка закончацца. Хацелася б, каб Віктара ўзялі назад на ферму.

Самога мужчыну мы засталі за ўзворваннем агарода знаёмым.

— Гэта вы пісалі пісьмо ў рэдакцыю? — пацікавілася ў яго.

— Не, не я, і нават не ведаю, хто гэта зрабіў, — адмоўна кіўнуў ён у адказ. — Але вельмі хачу вярнуцца на ранейшае месца работы. Нават згодны закадзіравацца.

— Але ж вы раней адмаўляліся, казалі, што грошай няма.

— Цяпер знайду — прадам жарабя, — запэўніў мужчына.

Калі б Віктар Д. прыйшоў, пагутарыў, запэўніў, што стаў на шлях выпраўлення, магчыма, і пайшлі б яму насустрач, разгледзелі яго просьбу, — такая пазіцыя кіраўніцтва. Ды ён нават не забраў працоўную кніжку. Выслалі яму па пошце заказным пісьмом з паведамленнем, дзе яна ляжыць і да гэтага часу.

## Лячэнне і працоўная тэрапія як выйсце

Бясспрэчна, па чалавечы мужчыну шкада. Але ж запойны работнік нікому не патрэбны. Які ж выхад з сітуацыі? Адзіны — кадзіраванне або тэрапія ў лячэбна-працоўным прафілакторыі.

З гэтым згодны і **ўчастковы інспектар Сяргей ШВАЙБОВІЧ,** які неаднаразова наведваў сям'ю. Змясціць Віктара Д. у ЛПП можна, калі на працягу года тры і больш разоў ён прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за здзяйсненне адміністрацыйных правапарушэнняў у стане алкагольнага ап'янення. «Будзем кантраляваць сітуацыю, і калі зловім п'яным, запратакалюем факт і будзем вырашаць пытанне», — рэзюмаваў Сяргей Уладзіміравіч.

— У Віктара Д. у сям'і пілі і маці, і бацька. Таму дачасна і пайшлі з жыцця. Хлопец закончыў базавую школу. Падчас вучобы на дом часта наведвалася былая дырэктар школы, выхоўвала, ушчувала бацькоў, літаральна прымушала гаспадыню прыбраць у хаце, — расказаў **старшыня Маісееўшчынскага сельвыканкама Аляксандр ПАЎЛАВЕЦ.** — Але па слядах бацькоў пайшоў і сын. Атрымаў зарплату — выпіў, не выйшаў на работу. Хто такога будзе трымаць? Паверце, мы змагаемся з такім кантынгентам усімі сіламі. Вось і Віктара выклікалі на пасяджэнне Савета грамадскага пункта аховы правапарадку, ды ён не з'явіўся. Гэты дом мы трымаем пад кантролем, разумеем, што можа здарыцца і пажар, і што заўгодна, рэгулярна наведваем са спецыялістамі, правяраем спраўнасць электраправодкі, печы. Прымусілі паставіць супрацьпажарны апавяшчальнік.

Што датычыцца ЛПП, то старшыня сельвыканкама ўпэўнены, што працоўная і лячэбная тэрапія пойдуць Віктару на карысць, калі ён сам гэтага захоча, задумаецца над тым, як змяніць свой спосаб жыцця.

Як лічаць спецыялісты, у ЛПП дзейнічае не медыцынскі, а хутчэй за ўсё эканамічны фактар, які дапамагае хворым на алкагалізм у працоўнай занятасці, дае магчымасць набыць спецыяльнасць. Выздараўленне пацыентаў немагчыма без іх свядомага моцнага жадання. Сюды яны трапляюць па рашэнні суда, а не добраахвотна. Акрамя таго, рэабілітацыя і адаптацыя грамадзян, якія змешчаны ў працоўныя прафілакторыі, патрабуе сучаснага падыходу. Магчыма, у будучым тут з'явяцца рэабілітацыйныя цэнтры, дзе з імі будуць працаваць псіхатэрапеўты, псіхолагі.

Але на сённяшні дзень такія ўстановы маюць і свае плюсы: лячэнне ад алкагольнай залежнасці, спадарожных захворванняў, здаровы спосаб жыцця на працягу 12 месяцаў, часовую перадышку для блізкіх суседзяў, гарантыю, што ніхто не спаліць дом у п'яным чадзе, не зломіць нос жонцы, не кінецца ў бойку на вуліцы. Ды, урэшце, не ўкрадзе чужога, не здзейсніць іншага правапарушэння, каб апахмяліцца і трапіць за краты.

Ну, а так званым праваабаронцам варта параіць не пісаць лісты без зваротнага адрасу, а сапраўды паклапаціцца разам з кіраўніцтвам гаспадаркі, мясцовымі органамі ўлады і праваахоўнымі органамі, каб вярнуць чалавека да нармальна жыцця.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# МАСТЫ НАВЕДЗЕНЫ...

**Мінскую вобласць наведала дэлегацыя італьянскага Чырвонага Крыжа. Замежныя госці мяркуюць вывучыць вопыт работы беларускіх калег з сацыяльна ўразлівымі катэгорыямі грамадзян — інвалідамі, пажылымі, вымушанымі перасяленцамі. А таксама — абмяняцца вопытам у арганізацыі медыка-сацыяльнай дапамогі і доглядзе дома, вывучыць работу з грамадзянамі, якія пацярпелі ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС.**

— Я адчуваю гонар пры наведванні Беларусі. У нас вельмі шмат агульнага. Па-першае, нас звязаў Чарнобыль, — сказаў **старшыня аддзялення італьянскага Чырвонага Крыжа ў рэгіёне Маркэ спадар Фабіа ЧЭКОНІ.** — Беларускіх дзяцей з пацярпелых рэгіёнаў адпраўлялі на азда-раўленне менавіта ў нашу краіну.

***— Якія сумесныя праекты ў найбліжэйшы час плануюцца?*** — пацікавілася «МС» у яго.

— Мы хочам перадаць свой вопыт прыцягнення валанцёраў у Чырвоны Крыж, расказаць, як у нас арганізавана работа з тымі людзьмі, якія маюць патрэбу ў дапамозе, паказаць, як у будучым развіць валанцёрскую дзейнасць так, каб у Чырвоным крыжы мог удзельнічаць і кожны ахвотны, каб людзі разумелі неабходнасць работы ў ім.

**Старшыня Мінскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Людміла МУСЯНКОВА** адзначыла, што гэты візіт стаў магчымы дзякуючы праекту «Мост», які фінансуецца Еўрапейскім саюзам. Праграма мае на мэце дапамогу ў наладжванні кантактаў паміж грамадзянамі Беларусі і краін ЕС.

Сёлета дэлегацыя Мінскай абласной арганізацыі вывучала вопыт работы рэгіянальных і мясцовых структур італьянскага Чырвонага Крыжа.

— Нам вельмі спадабалася дзейнасць атрадаў хуткага рэагавання пры надзвычайных сітуацыях, тое, як у іх наладжана работа, аказанне першай медыцынскай дапамогі, псіхаэмацыянальнай падтрымкі. Гэтыя кірункі будзем рэалізоўваць у Мінскай вобласці, — адзначыла Людміла Сяргееўна.

Плануецца, што замежныя госці на працягу чатырох дзён наведаюць Жодзіна, Барысаў, Вілейку, Мядзел, азнаёмяцца з работай атрадаў хуткага рэагавання «Ісдач» і «Бярэзіна», абмяркуюць пытанні супрацоўніцтва па распрацоўцы і рэалізацыі сумесных праектаў па абароне сацыяльна ўразлівых катэгорый грамадзян, грамадзян, пацярпелых ад чарнобыльскай аварыі. Пабываюць італьянцы і ў Мінскім раёне, які нядаўна атрымаў гуманітарны груз.

Чакаецца, што па выніках візіту будзе падпісана пагадненне аб сумесным супрацоўніцтве. «Хацелася б, каб мы ўзаемадзейнічалі не толькі на ўзроўні кіраўніцтва нашых арганізацый, але і рэгіянальным узроўні», — падкрэсліла Людміла Мусянкова.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# ...АБСТАЛЯВАННЕ ДАСТАЎЛЕНА

## Тры бальніцы ў Гомельскай вобласці атрымалі новыя дыягнастычныя апараты

**Медыцынскія ўстановы Гомельшчыны, праекты якіх перамаглі ў конкурсе пасольства Японіі ў Беларусі «Карані травы», атрымалі новае дыягнастычнае абсталяванне на агульную суму 217 тысяч долараў.**

Ва ўрачыстай абстаноўцы перадаў яго бальніцам Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Японіі ў Рэспубліцы Беларусь Хірокі Такунага, які гэтымі днямі наведвае Гомельскую вобласць. Хойніцкая цэнтральная раённая бальніца атрымала бронхаскоп і каланаскоп. Яны закуплены на суму 60 450 долараў. У Гомельскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы, якая выйграла грант у памеры 80 400 долараў, з'явіўся новы гастраскоп, у якім медыцынская ўстанова мела патрэбу. Гастраскоп закуплены і для Калінкавіцкай цэнтральнай раённай бальніцы. Яна выйграла ў конкурсе грант у памеры 76 350 долараў. На ўрачыстых цырымоніях перадачы прынялі ўдзел мясцовыя органы ўлады, калектывы бальніц, прадстаўнікі МНС і Дэпартамента па гуманітарнай дзейнасці Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта.

У межах праграмы «Карані травы» з 2004 года ў Беларусі быў рэалізаваны 51 праект, у тым ліку 28 — у Гомельскай вобласці, якая найбольш пацярпела ад катастрофы на ЧАЭС. Пераважная большасць з іх — у медыцынскай галіне. Сродкі мэтанакіравана выдзяляліся для набыцця медыцынскага абсталявання. Агульная сума грантаў, выдзеленых Беларусі за гэты час у межах праграмы, перавысіла чатыры мільёны долараў.

**Алена КРАВЕЦ.**

ЗАПРАШАЛЬНІК

# З ТУЛУЗЫ Ў БАРЫСАЎ

**23—24 лістапада ў Барысаве і ваколіцах пройдзе міжнародны ваенна-гістарычны фестываль «Бярэзіна-1812». На мерапрыемстве, якое актывісты руху гістарычнай рэканструкцыі штогод ладзяць пры падтрымцы Барысаўскага райвыканкама і пасольства Францыі ў Беларусі, удзельнікі з розных краін свету аднаўляюць падзеі бітвы 1812 года і пераправы Напалеона цераз Бярэзіну блізу вёсак Студзёнка і Брылі.**

Адкрые сёлетні фэст парад барысаўскіх уніфармістаў і клубаў ваенна-гістарычнай рэканструкцыі, які пройдзе ад прывакзальнай плошчы да Чычагаўскіх батарэй — чакаецца, што ў ім возьме ўдзел каля 500 чалавек. Таксама ў праграме рэканструкцыі — баталія, цырымоніі па ўшанаванні памяці загінулых французскіх і рускіх салдат, тэатралізаваная пастаноўка, рэканструкцыя бітвы на Брылёўскім полі і нават... спаборніцтвы па плаванні! Фарсіраваць раку, як гэта зрабілі французы 207 гадоў таму, рашыліся не толькі замежныя госці, але і спартсмены Беларускай федэрацыі загартоўвання і спартыўнага зімовага плавання.

Дарэчы, у 1812-м пераправу для напалеонаўскай арміі наводзілі 400 пантанёраў, але пры 23-градусным марозе выжылі толькі адзін... У сучасным Барысаве за бяспекай удзельнікаў і гасцей маштабнай гістарычнай рэканструкцыі будуць сачыць медыкі, ратавальнікі МНС і Таварыства выратавання на вадзе. «Ваенныя выдзяляюць нам армейскія намёты з печкай, каб удзельнікі заплыву маглі сагрэцца і пераапрануцца ў камфортных умовах, таксама прадугледжана лазня, абавязкова будуць наладжаны пункты з гарачым чаем і харчаваннем», — дадае **в.а. кіраўніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Барысаўскага райвыканкама Ала ЛЕНКІНА.**



Фота БелТА.

Падчас рэканструкцыі ў 2018 годзе.

Паралельна адбудуцца тэматычныя культурныя імпрэзы. Краязнаўчы цэнтр раённай бібліятэкі імя І. Х. Каладзеева правядзе цэлы тыдзень падзей памяці 1812 года, супрацоўнікі Барысаўскага аб'яднанага музея запрашаюць наведвальнікаў на выстаўкі «Тэма Напалеонікі ў філакартыі» і «Вайна 1812 года ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве». Таксама будуць прадстаўлены новая гістарычная карціна з батальнай майстэрні Уладзіміра Сайко і монаспектакль «Вялікая гісторыя аднаго маленькага гузіка» Вольгі Калачовай. Ваенны аркестр з Тулузы, які прыедзе на фэст упершыню, дасць для гараджан канцэрт духавой музыкі, а ў Палацы культуры адбудзецца грамадскі баль, падрыхтоўка да якога ідзе поўным ходам — ахвотныя развучваюць полькі, вальсы і мазуркі.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**


**РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 23 декабря 2019 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже объекта недвижимости, расположенного по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н., Жмуровский с/с, д. Пригородная, ул. Урожайная, 5В, принадлежащего открытому акционерному обществу «Речицкий межрайавтотранспорт» на праве собственности**

| № лота | Наименование объекта | Краткая характеристика объекта | Начальная цена, руб. (в т. ч. НДС по ставке 20 %) | Задаток, руб. (в т. ч. НДС по ставке 20 %) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Автозаправочная станция, **инв. № 340/С-313184** | Назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции). Одноэтажное кирпичное здание, год постройки 1974. Общая площадь 13,7 кв. м. Составные части и принадлежности: два крыльца, три ограждения, калитка, двое ворот | **54 648,00** | **5 464,80** |

***Земельный участок** для обслуживания автозаправочной станции на праве постоянного пользования площадью **0,5260 га** с кадастровым номером 324550100001001215. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь*

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 20 декабря 2019 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **23 декабря 2019 г**. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объект по начальной цене, увеличенной на 5 %.

**При подаче заявления участник должен иметь**: 1) копию платежного документа с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; консолидированные участники дополнительно представляют копию договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY84ALFA30122305700080270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г.Минск, BIC: ALFABY2X. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту №1** согласно извещению в газете «Звязда» от 22 ноября 2019 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан**: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 4 % от окончательной цены продажи Объекта; в течение 15 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не будет достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты Объекта, такая оплата должна быть произведена в течение 5 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи Объекта.

**Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23. ☎ 8 (0232) 32-46-47; 32-18-95 • сайт: gino.by • e-mail: auction-gino@gino.by**
**Продавец: ОАО «Речицкий межрайавтотранспорт», Гомельская обл., г. Речица, ул. Урожайная, 8. ☎ 8 (02340) 9-60-51, 3-72-04, 8 (029) 338-94-10**



**ОАО «Климовичский ликеро-водочный завод» сообщает**, что электронные торги по продаже недвижимого имущества (расположенного по адресу: Могилевская область, Кричевский район, Лобковичский с/с, 4/1, 0,3 км западнее г. Кричева) состоятся 05.12.2019 года. Электронные торги по продаже имущества (расположенного по адресу: Могилевская область, Быховский район, аг. Грудиновка и Могилевская область, г. Климовичи, ул. Волкова, 10) состоятся 23.12.2019 года. Информацию об условиях проведения электронных торгов можно уточнить на сайтах torgi.gov.by и bankrot.gov.by.
УНП 700103211



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 21 лістапада 2019 года.**